ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (з дармовым дадаткам „Прафрух“)

На 1 мес. . . — 90 к.
„ 3 мес. . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . 5 р. —
„ 12 мес. . . 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок нсмп. пасьля тэксту—50 к., Іншагароднія абвесткі—1 р. за радок. Паскрод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. надбавку.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

Пралетары усіх краін, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
„ абвестак . . 7-81

СЕРАДА 21 мая 1930 г.
№ 117 (3715)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

Пастанова сакратарыяту ЦК КП(б)Б

Заслухаўшы паведамленьне сэктару друку Культпропу ЦК КП(б)Б, адзначыць надзвычайна важнае палітычнае значэньне ўмовы аб сацыялістычным спаборніцтве паміж газэтамі БССР і Заходняй вобласьці па пытаньнях падрыхтоўкі і асьвятленьня Ўсесаюзнага Зьезду ЎсеКП(б). Абавязаць усе рэдакцыі цэнтральных і акруговых газэт прыняць самыя энэргічныя і ініцыятыўныя захады на забесьпячэньню поўнага выкананьня ўмовы аб сац. спаборніцтве.

Абавязаць усе партыйныя арганізацыі, партчасткі, гаспадарчыя, прафсаюзныя і савецкія ўстановы і арганізацыі Беларусі забясьпечыць поўную дапамогу цэнтральным, акруговым і фабрычна-заводзкім газэтам у справе падрыхтоўкі і правядзеньня масавых арганізацыйных мерапрыемстваў, зьвязаных з падрыхтоўкай да надыходзячых партыйных зьездаў.

Для дапамогі рэдакцыям цэнтральных газэт у правядзеньні падрыхтоўкі да Ўсебеларускага і Ўсесаюзнага зьездаў партыі мабілізаваць па месяц 60 чалавек.

Правядзеньне падбору 60 чалавек даручыць у аднадзенны тэрмін камісіі ў складзе т.т. Баля, Будзінскага і Курціка. Сьпіс камандыраваных зацьвердзіць на сакратарыяце ЦК КП(б)Б.

Зацьвердзіць пасылку дэлегацыі ад друку БССР у Смаленск. Пэрсанальны склад дэлегацыі даручыць складзі сэктару друку Культпропу ЦК КП(б)Б.

Пачаць у цэнтральных і акруговых газэтах Беларусі шырокае асьвятленьне падрыхтоўкі да партыйных зьездаў Заходняй вобласьці і ходу спаборніцтва паміж друкам БССР і газэтамі Заходняй вобласьці.

ДАГАВОР

па сацыялістычным спаборніцтве цэнтральных газэт БССР

на лепшую арганізацыю газэтнага паходу падрыхтоўкі, асьвятленьня і прапрацоўкі рашэньняў XVI партзьезду ЎсеКП(б)

Цэнтральныя газэты БССР—«Зьвязда», «Рабочий», «Савецкая Беларусь» і «Беларуская Вёска» прымаюць на сябе і выклікаюць усе акруговыя і нізавыя газэты і рабселькораў прыняць наступныя абавязацельствы:

1. Неадкладна пераключыць усю работу на масавую падрыхтоўку да партзьезду; у часе работы зьезду — на лепшае асьвятленьне яго работы, па сканчэньні зьезду — на лепшую папулярызацыю сярод шырокіх мас пастаноў зьездаў КП(б)Б і ЎсеКП(б).

2. Арганізаваць масавы збор прапаноў рабочых і калгасьнікаў па пытаньнях, якія стаяць у парадку дня XIII зьезду КП(б)Б і XVI зьезду ЎсеКП(б), пры гэтым па ўсіх прадпрыемствах арганізаваць, у першую чаргу збор прапаноў рабочых па паляпшэньні вытворчасьці і зьніжэньні сабекошту.

3. Павесьці шырокую работу па арганізацыі новых ударных брыгад імя XVI партзьезду.

4. Выступіць пачынальнікамі арганізацыі папярнага сацспаборніцтва цэхавых парт- і прафарганізацый па асноўных галінах партыйнай і прафработы.

5. Арганізаваць ва ўсіх цэхах і калгасах, прымаючых да кожнай газэты, з мэтаю ўдзелу ў выкананьні гэтага дагавору, апорныя пункты і патрулі газэт.

6. Тэрмін гэтага дагавору (па падрыхтоўцы да партзьезду, асьвятленьні яго ходу і замацаваньні яго пастаноў у масах)—1 кастрычніка 1930 г.

Вызначэньне сацыялістычнага пярэмыства цэнтральных газэт БССР у сацспаборніцтве па гэтым дагавары правесьці праз трыбунал газэтнага спаборніцтва пры культпропе ЦК КП(б)Б.

Прыняць, як асноўную меру апэнкі сацыялістычнага пярэмыства: масавы размах і якасьць праведзенай работы (у сэнсе ўжываньня новых форм, мэтадаў і г. д.).

ЦЭНТРАЛЬНЫЯ ГАЗЭТЫ БССР: «ЗЬВЯЗДА», «РАБОЧИЙ», «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ», «БЕЛАРУСКАЯ ВЕСКА».

Падрыхтоўка да зьездаў партыі—экзамэн нашаму друку

Зараз праходзяць раённыя і акруговыя партыйныя канфэрэнцыі.

Хутка—Ўсебеларускі і ўсьлед за ім Ўсесаюзны зьезды нашай Камуністычнай партыі.

Двухмільённая партыя на сваіх канфэрэнцыях і зьездах павінна будзе падагуліць той вялізарны шлях, які пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі, прайшоў за апошнія два гады Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, і разам з тым вызначыць далейшыя шляхі замацаваньня посьпехаў у справе сацыялістычнага будаўніцтва і прасоўваньня наперад.

Партыйна-савецкі друк, які зьяўляецца ня толькі скарбонкай калектыўнае практыкі, але і сапраўдным арганізатарам і прапагандыстам, павінен адыграць важнейшую ролю ў справе мабілізацыі ўсёй партыйнай арганізацыі, усёй рабочай клясы вакол тых пытаньняў, якія будуць разглядацца і вырашацца на надыходзячых Усебеларускім і Ўсесаюзным зьездах партыі.

Тав. Молатаў у сваім вядомым артыкуле «Новае сярод рабочых» пісаў: «... Новае сярод рабочых у тым, што ўскапляўшаяся за апошнія гады грамадзкая актыўнасьць у іх асяродзьдзі пераходзіць зараз у бурны прыліў рабочых мас у партыю, у магутнае будаўніцтва ўдарных калён пралетарыяту на заводах. Стваравоцца ўдарныя брыгады, ударныя батальёны, ударныя арміі на вытворчасьці. Камуністычны рух аўладае пралетарыятам... Новае сярод рабочых прад'яўляе новыя патрабаваньні ўсім пралетарскім арганізацыям, і ў першую чаргу іх кіраўніком... Новы і яшчэ нябачаны па сваім размаху ўздым у рабочых масах патрабуе немалых зьмен ва ўсіх формах і мэтадах нашай работы...»

Наш друк павінен з вычарпальнай паўнатой, з найбольшай выразнасьцю і грунтоўнасьцю навочна паказаць, выявіць усё тое «новае», чаго мы за апошнія два гады дасягнулі ў нашай рабоце, паказаць якія ўжо праведзены зьмены ў формах і мэтадах нашай работы.

Мы патрабуем ад друку ня толькі АСЬВЯТЛЕНЬНЯ тае падрыхтоўкі, якая праходзіць да партыйных зьездаў, мы ў першую чаргу патрабуем ад усяго нашага друку, каб ён выказаў здольнасьць знайсьці найбольш правільныя, найбольш гібкія формы самага шырокага прыцягненьня працоўных мас да падрыхтоўкі да XIII зьезду КП(б)Б і XVI зьезду ЎсеКП(б).

НА СЁНЕШНІ ДЗЕНЬ ПАДРЫХТОЎКА ДА ЎСЕБЕЛАРУСКАГА І ЎСЕСАЮЗНАГА ЗЬЕЗДАЎ ПАРТЫІ, З БОКУ ЎСІХ, БЕЗ ВЫКЛЮЧЭНЬНЯ, ЦЭНТРАЛЬНЫХ, АКРУГОВЫХ І ФАБРЫЧНА-ЗАВОДЗКІХ ГАЗЭТ НІ Ў ЯКІМ РАЗЕ НЯ МОЖА БЫЦЬ ПРЫЗНАНА ЗДАВАЛЬНЯЮЧАЙ І АДПАВЯДАЮЧАЙ ТЫМ ПАВЫШАНЫМ ЗАПАТРАБАВАНЬНЯМ, ЯКІЯ ЗАРАЗ ПАРТЫЯ ПРАД'ЯЎЛЯЕ ДА НАШАГА ДРУКУ Ў СПРАВЕ МАБІЛІЗАЦЫІ МАС НАВОКАЛ НАДЫХОДЗЯЧЫХ ЗЬЕЗДАЎ ПАРТЫІ

Пакуль што нашы газэты падрыхтоўку да зьезду праводзяць урыўкамі, яз шырокага ініцыятыўнага размаху апраўднай масавай работы.

Газэты Савецкай Беларусі пакуль што шчэ не змаглі з бальшавіцкай настойлівасьцю і размахам разгарнуць па-сапраўднаму сваю работу на адказнейшым палітычным вучастку—вучастку масавай, паглыбленай, не абмяжоўваючайся толькі зьмяшчэньнем справаздач аб партыйных канфэрэнцыях, падрыхтоўкі да зьезду партыі.

І таму надзвычай сваячасова зьяўляецца тая ініцыятыва, якую праявілі газэты і рабселькоры Заходняй вобласьці, выклікаўшыя друк БССР на сацыялістычнае спаборніцтва па лепшай арганізацыі і масавай падрыхтоўцы да надыходзячых партыйных зьездаў і папулярызацыі пастаноў гэтых зьездаў.

« ... Пачаўшыяся канфэрэнцыі—піша ў перадавым артыкуле цэнтральны орган нашай партыі газэта «ПРАВДА»—сьведчаць аб тым, што шмат якія партыйныя арганізацыі ўмеюць знайсьці форму шырокага прыцягненьня мас да падрыхтоўкі да XVI зьезду. Так, Заходняя вобласьць разаслала па вобласьці брыгады партыйцаў для падрыхтоўкі да раённых і акруговых партыйных канфэрэнцый. Абласная нарада рэдактароў абласных газэт, акруговых, фабрычна-заводзкіх насьценных і друкаваных у Заходняй вобласьці выклікала на спаборніцтва друк Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі па падрыхтоўцы да XVI зьезду партыі. Гэта спаборніцтва ставіць перад друкам задачу павярнуцца тварам да масавай падрыхтоўкі акруговых, абласных партканфэрэнцый і XVI партзьезду. Адпаведным чынам перабудаваць работу газэт, узмацніць рэдкалегію, правёўшы нараду пры рэдакцыях газэт актыву, тэхпэрсаналу, ударнікаў, рацыяналізатараў, арганізаваць новыя ударныя брыгады імя XVI партзьезду... «Рабочий путь», орган Заходняй вобласьці, высоўвае праграму пытаньняў, вакол якіх неабходна мабілізаваць увагу мас... орган Заходняй вобласьці высоўвае канкрэтнае патрабаваньне па падрыхтоўцы XVI зьезду і абласной партканфэрэнцыі».

Справа разгортваньня, пад кіраўніцтвам партыйных камітэтаў, масавай папрадзьездаўскай падрыхтоўкі і наступнай кампаніі папулярызацыі пастаноў зьезду павінна будзе зьявіцца СВАЯ-АСАБЛІВЫМ БАЯВЫМ РАПАРТАМ ЗЬЕЗДАМ ПАРТЫІ АД ДРУКУ БССР АБ ТЫМ, ЯК ДРУК АДЗІН З ВАЖНЕЙШЫХ ПРЫВАДНЫХ РАМЯНЁЎ ПАРТЫІ ЎМЕЕ МАБІЛІЗАВАЦЬ І АРГАНІЗАВАЦЬ МАСЫ НАВАКОЛ БАРАЦЬБЫ ЗА ГЕНЭРАЛЬНУЮ ЛІНІЮ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ.

У сёнешнім нумары газэты «Зьвязда» друкуюцца матар'ялы, якія канкрэтна характарызуюць паказчыкі, што зьяўляюцца рашаючымі пры вызначэньні вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва паміж друкам БССР і Заходняй вобласьці.

Нашаму друку прадстаіць здаць перад тварам партыі і рабочай клясы яшчэ адзін адказнейшы экзамэн.

Падрыхтоўка нашых газэт да зьезду партыі, формы і масавасьць гэтай падрыхтоўкі, уменьне зачапіцца за асноўнае, вядучае зьвяно, не разьменьваючыся на дробязі—навочна пакажа, наколькі кожная з нашых цэнтральных і акруговых газэт шчыльна зьвязана з партыйнымі арганізацыямі і рабочымі масамі, наколькі нашы газэты навучыліся хутка, апэрацыйна пераключаць увесь свой зьмест, увесь свой апарат і ўсю шырока разгалінаваную магутную сетку рабселькораў на бявое, мэтаімкненнае вырашэньне адказнейшых пытаньняў, адным з якіх зараз зьяўляецца падрыхтоўка да партыйных зьездаў.

Увесь друк БССР — пачынаючы цэнтральным ворганам нашай партыі газэтай «Зьвязда» і канчаючы нядаўна арганізаванымі насьценнымі газэтамі будаўнікоў-сэзоньнікаў, уся маса рабкораў, селькораў, юнкораў, ваенкораў, рэдкалегій насьценных і фабрычна-заводзкіх друкаваных газэт, уся тая грамадзкасьць, якая згуртавана навокал нашага друку, павінна быць на сапраўднаму мабілізавана для пасьпяховага правядзеньня шырокай, масавай і дзелавой падрыхтоўкі да партыйных зьездаў.

Барабанны бой, параднасьць, павярхоўны падыход, папітычная траскатня—могуць зьвесьці на нішто работу газэт па мабілізацыі мас навокал зьезду, выпусташыўшы зьмест, істотнасьць тых вузлавых пытаньняў, вакол якіх друк, як падважнік партыі, мабілізуе ўвагу і сілы мас.

Зараз асноўнай задачай газэт зьяўляецца—навочна паказаць на канкрэтным мясцовым матар'яле, тую вялізарную практыку ва ўсіх галінах работы, тыя вялізарныя дасягненьні, якія назьбіраны і дасягнуты рабочай клясай і яе камуністычнай партыяй. Разам з гэтым мы павінны памятаць наступныя радкі з артыкулу т. ЛЕНІНА «О характере наших газет».

—«... Пабольш эканомікі, але эканомікі ня ў сэнсе агульных меркаваньняў, вучоных агляду, інтэлігенцкіх плянаў і гэткай-жа «дребедени», якая занадта часта зьяўляецца сапраўды «дребеденью». НЕ. ЭКАНОМІКА ПАТРЭБНА НАМ У СЭНСЕ ЗЬБІРАНЬНЯ ДАСКАНАЛАЙ ПРАВЕРКІ І ВЫВУЧЭНЬНЯ ФАКТАЎ САПРАЎДНАГА БУДАЎНІЦТВА НОВАГА ЖЫЦЬЦЯ».

Наш друк абавязаны на глебе гэтага навочнага паказу практыкі, крытычнага аналізу праробленай работы яшчэ шчыльней згуртаваць рады камуністычнай партыі, рады ўсіх працоўных навакол барацьбы за генэральную лінію партыі.

Наш друк усёй сваёй падрыхтоўчай работай да надыходзячых зьездаў партыі павінен дапамагчы яшчэ большаму ўзмацненьню барацьбы супроць правага ўхілу, як найбольш небясьпечнага на даным этапе, супроць «левых» загібаў, якія ўзмацняюць пазыцыі правага ўхілу, супроць прымірэнчых адносін да гэтых ухілаў, яшчэ больш згуртаваць масы навакол барацьбы з нацыянал-апартунізмам, беларускім нацыянал-дэмакратызмам, влікадзяржаўным шавінізмам і шавінізмамі ўсіх іншых колераў.

Камуністычная партыя, разгортваючы самую шырокую, масавую падрыхтоўку да сваіх зьездаў, гэтым самым яшчэ больш замацоўвае непарушную сувязь з шырачэзнымі масамі працоўных, спрыяючы далейшаму разгортваньню самай шырокай самакрытыкі, яшчэ больш мабілізуючы масы навокал генэральнай лініі партыі, за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады, за ліквідацыю кулацтва, як класы, на падставе суцэльнай калектывізацыі—і ўсім гэтым хутчэй набліжаючы перамогу пралетарскай рэвалюцыі ва ўсім сьвеце.

А. КУРЦІК.

Аб'яднаем намаганьні, абмяняемся вопытам

Аб масавым газэтным паходзе ў Заходняй вобласьці

XVI зьезду ЎсеКП(б) і папярэднім ясцовым партыйным зьездам і канфэрэнцыям надыходзіць падагуліць вынікі і вызначыць выразныя пэрспэктывы работы партыі на новым этапе сацыялістычнага наступленьня у надзвычай складанай міжнароднай і ўнутранай абстаноўцы.

Выключная абстаноўка, выключнае значэньне зьезду абавязваюць пралетарскую грамадзкасьць да нейкіх новых выключных мерапрыемстваў па ўцягненьні мас сьпярша ў падрыхтоўку, а потым у актыўнейшую работу і барацьбу па ажыцьцяўленьні пастаноў XVI зьезду. У гэтых мэтах друк суседняй з БССР Заходняй вобласьці, паводле агульнай прапановы Заабкому ЎсеКП(б), выступіў да разгортваньня сваясаблівага масавага газэтнага паходу—падрыхтоўкі да II вобласной партканфэрэнцыі (адкрыецца 5-га чэрвеня) і XVI партзьезду.

Прыкваць усю ўвагу мас да канфэрэнцыі і зьезду, стварыць новы ўздым актыўнасьці і энтузіязму ў барацьбе за генэральную лінію партыі, падрыхтаваць найбольш спрыяючыя ўмовы для правядзеньня лёзунгаў і рэзалюцый зьезду — вось асноўныя задачы разгорнутай кампаніі, на якую мабілізавана ся сетка газэт Заходняй вобласьці (ад галіх абласных да цэхавых насьценгазэт). Усе газэты і рабселькоры, у кораі перабудоўваючы сваю работу на асноўе ўдарнасьці і масавасьці, выступаць адзіным фронтам, спаборнічаюць адзін з другім у межах вобласьці, акругі, раёну, прадпрыемства і г. д.. Абласная нарада рэдактароў абласных, акруговых і друкаваных фабрычна-заводзкіх газэт вобласьці выклікаюць на сацспаборніцтва прасу і рабселькораў Беларусі. Асноўная мэта выкліку — не «набіць» у паборніцтве, а паміняцца вопытам, авяраць і палепшыць новыя мэтады організацыйна-масавай газэтнай работы.

Зразумела, што стварыць сапраўдны іх сапраўдных мас газэты толькі сваімі сіламі ня змогуць. Таму, у дапамогу у Заходняй вобласьці выступаюць артыйныя, прафсаюзныя, савецкія і пп. арганізацыі, — яны перш за ўсё лучаюць работніцкую, якія выяжджаць на месцы і арганізуюць густую сетгазэтных брыгад, апорных пастоў, трулёў. Гаспадарнікі, плянавікі, інжэнэрна-тэхнічны пэрсанал, студэнцтва д. згуртоўваюцца вакол газэт на спэяльных нарадах, якія праводзяцца пры рэдакцыях. Кожны бярэ свой вучастак работы і на гэтым вучастку дапамагае газэце ўцягнуць масы і найбольш мэтазгодна скарыстаць іх актыўнасьць.

Распыляцца шкодна. Таму заходнім друкам узята ўсяго 10 асноўных пытаньняў — асноўных аб'ектаў падрыхтоўкі: перабудова партработы, парткадры, ільна-канопляводзтва, капітальнае будаўніцтва, узмацненьне калгасаў і ўзмоцненае завяршэньне сяўбы, зьніжэньне сабекошту, узмацненьне работы з батрацтвам і беднатой, ударніцтва і перабудова прафработы, падрыхтоўка кадраў, шэфства рабочых над савапаратам. Па гэтых 10-ці напрамках і працуюць газэтныя брыгады, апорныя пасты і патрулі, — зьбіраюць матар'ял, вывучаюць яго і — самас каштоўнае — зьбіраюць практычныя прапановы рабочых, калгасьнікаў, тэхнікаў і г. д., бераржліва зьбіраюць і абагульваюць вопыт мас.

У якой стадыі знаходзіцца зараз гэта работа ў Заходняй вобласьці? Абласныя, акруговыя, друкаваныя фабрычна-заводзкія і некаторыя раённыя газэты з іх рабселькорамі—мабілізаваны. Абласныя і акруговыя арганізацыі і ўстановы, рабочыя прадпрыемствы, служачыя ўстаноў, вучнёўства і настаўнікі ВНУ і тэхнікумаў, якія знаходзяцца ў абласных і акруговых цэнтрах, у значнай частцы ўцягнуты ў кампанію, але яшчэ не даюць, або мала даюць прапаноў па пытаньнях, вызначаных да прапрацоўкі. Галоўнае яшчэ ўперадзе — яшчэ толькі выехалі арганізатары ў аддаленыя прадпрыемствы, у раёны, сельсаветы, калгасы (усё гэта, зразумела, у выбарачным парадку). Тут раскалыхваньне яшчэ толькі пачынаецца, спаборніцтва на лепшую падрыхтоўку толькі разгортваецца.

Праводзячы ўсю гэту работу, павышаючы ў працэсе яе актыўнасьць і ініцыятыву мас на перамогу труднасьцяй, прыцягваючы і абагульваючы каштоўнейшы вопыт мас — зьбіраючы практычныя прапановы па вузлавых пытаньнях сацыялістычнага наступленьня, мы больш усяго павінны ўнікаць двух небясьпек—1) сарвацца да голага практыцызму, да дзяляцтва і 2) апынуцца ў палітычнай трэскатні. Усім удзельнікам газэтнага паходу мы стараемся даць выразныя палітычныя ўстаноўкі з тым, каб яны ўмелі пранізаць палітыкай практыку мас і, разам з тым, мы папраўляем ад палітычных схэм, не прасякнутых практычным сэнсам. Усёй рабоце па ўсіх пытаньнях мы даем напрамак у пляне барацьбы за генэральную ленінскую лінію партыі, з усімі скажэньнямі і ўхіламі ад яе — барацьбы на два фронты—з галоўнейшым правым апартунізмам і «левым» паўтрацкізмам. Па ступені — па колькасьці і якасьці, па ліку і моцнасьці ўцягненьня мас у гэту барацьбу належыць расцэньваць, урэшце, работу бакоў, якія спаборнічаюць у масавым газэтным паходзе.

Вельмі многае вырашае тэмп. Посьпех забясьпечвае толькі рэвалюцыйныя сапраўды-бальшавіцкія тэмпы ў рабоце, без абмежаваньня часу, часамі нават без «выхадных дзён» — ясная сьвядомасьць кожным удзельнікам паходу таго, што ён сапраўды мабілізаваны на час падрыхтоўкі зьезду, асьвятленьня яго ходу, папулярызацыі яго пастаноў. У гэтым паходзе газэтныя работнікі і рабселькоры здаюць сапраўдны экзамэн на права далейшага ўдзелу у масавым пралетарскім друку, з яго ўскладненымі задачамі і павышанай адказнасьцю, на ганаровую і абавязвуючую годнасьць газэтчыкаў і рабселькораў рэканструкцыйнага пэрыяду. Партыйныя і іншыя арганізацыі, у сваю чаргу, праходзяць праверку ўсьведамленьня ленінскіх паказаньняў аб друку, праверку здольнасьці выкарыстаць друк, як адну з лепшых прылад да арганізацыі найшырэйшых мас наўкола партыі, яе задач і лёзунгаў.

С. ЯЎГЕНАЎ.

ПАЗАЧАРГОВЫ СХОД

рабкораў рэдкалегій насьценгазэт і усіх працаўнікоў друку

Сёньня ў клюбе друкароў, а 7 гадз. веч., рэдакцыі цэнтральных газэт і ЦБ сэкцыі працаўнікоў друку склікаюць сход рабкораў рэдкалегій насьценных газэт і ўсіх працаўнікоў друку па пытаньні аб спаборніцтве паміж газэтамі, рабкорамі Заходняй вобласьці і друкам і рабкорамі БССР.

У парадку дня: АБГАВАРЭНЬНЕ ДАГАВОРУ АБ САЦСПАБОРНІЦТВЕ З ПРАДСТАЎНІКАМІ ГАЗЭТ І РАБСЕЛЬКОРАЎ ЗАХОДНЯЙ ВОБЛАСЬЦІ, ЯКІЯ ПРЫБЫЛІ Ў МЕНСК.

РЭДАКЦЫІ ЦЭНТРАЛЬНЫХ ГАЗЭТ.
ЦБ СЭКЦЫІ ПРАЦАЎНІКОЎ ДРУКУ.

Гаспадарка Нямеччыны—па нахільнай роўніцы

БЕРЛІН, 19. Эканамічная канъюнктура ў Нямеччыне ўсё пагаршаецца і ў першай палове мая. Нават сэзоннае ажыўленьне тэкстыльнай і швэйнай прамысловасьці спынілася і тэкстыльная прамысловасьць паведамляе аб новых масавых звальненьнях рабочых.

Яшчэ больш пагоршылася становішча ў рашаючых галінах прамысловасьці, асабліва ў мэтапюргічнай і ў горнай. У рэйнскай горнай прамысловасьці здабыча ў красавіку панізілася, у параўнаньні з сакавіком, на 10 проц., а ў параўнаньні з красавіком 1929 г.—на 18,6 проц. Разам з тым, кожны дзень прыносіць новыя вылазкі прадпрыемцаў супроць рабочых, асабліва ў горнай, мэталюргічнай і хэмічнай галінах прамысловасьці. Сёньня паведамляюць аб тым, што мяркуецца зачыненьне 3-х капальняў у Рэйнскай вобласьці, па якіх занята 1.600 чалавек. Звальненьні працягваюцца і ў Рэйнскай горнай прамысловасьці. На заводзе «Фэнікс», у Дзюсэльдорфе, адміністрацыя, бяз усякіх палярэджаньняў і перагавораў, абвясьціла аб новым зьдзельным тарыфе, паводле якога зарплата зьніжаецца на 20 проц.

Орган гандлёвай палаты Рурскай вобласьці «Рур Ўнд Рэйн» заяўляе: «Мы сёньня стаімо перад пытаньнем, ці ісьці па цяперашнім шляху спыненьня працы па буйных прадпрыемствах, ці працягваць павялічваць беспрацоўе, або дабіцца новага ўрэгуляваньня ўмоў зарплаты і рабочага часу і аднавіць свае сілы для канкурэнцыі шляхам зьніжэньня сабекошту». У сваім наступленьні на рабочых прадпрыемцы рашаючых галін цяжкой прамысловасьці выступаюць адзіным фронтам. Прадпрыемцы мэталюргічнай і горнай прамысловасьці заключылі згоду са спажыўцамі іх прадукцыі, у першую чаргу з судабудаўнічай прамысловасьцю, аб узаемным падтрыманьні ў часе лёкаўтаў і забастовак.

Рэфармісцкія і каталіцкія прафсаюзы нічога ня робяць для барацьбы з гэтым наступленьнем прадпрыемцаў. **Арганізацыя абароны і контр-наступленьня вядзецца пад кіраўніцтвам рэвалюцыйнай прафапазыцыі.** Учора ў Дуісбургу адкрылася канфэрэнцыя рэвалюцыйнай апазыцыі, якая распрацоўвае мерапрыемствы па стварэньні адзінага фронту мэталістых з гарнякамі паўночна-заходняй вобласьці, таксама як і з мэталістымі ў іншых вобласьцях Нямеччыны, а таксама з беспрацоўнымі.

VIII Менская акрпартканфэрэнцыя

КАНФЭРЭНЦЫЯ ЎХВАЛЯЕ ПАЛІТЫЧНУЮ ЛІНІЮ ЦК КП(б)Б

Спрэчкі па дакладу сакратара ЦК КП(б)Б тав. Гея

Вячэрняе пасяджэньне

На вячэрнім пасяджэньні 19 мая канфэрэнцыя абмяркоўвала даклад тав. Гея аб рабоце Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б.

Тав. **Ластоўскі** ў сваім выступленьні спыніўся на пытаньнях сельскае гаспадаркі, у прыватнасьці, ён гаварыў аб жывёлагадоўлі.

— Жывёлагадоўля, сказаў т. Ластоўскі, ва ўмовах Беларусі мае вялікае значэньне. Між тым, крэдытныя органы не садзейнічалі пасьпяховаму вырашэньню праблемы жывёлагадоўлі. Толькі за апошні год у гэтым напрамку мы маем пэўны пералом. У 1929-30 годзе па разьвіцьцё жывёлагадоўлі ў параўнаньні з мінулымі гадамі асыгнаваны вялікія крэдыты. Мы павінны забясьпечыць рацыянальнае і правільнае скарыстаньне адпушчаных сродкаў.

Тав. **Гершон** гаворыць аб посьпехах калгаснага будаўніцтва. Ён адначае, што веснавая сяўба ў калгасах БССР у асноўным праходзіць добра. Гэта выклікае новы прыліў у калгасы. Разучае выпраўленьне памылак і перагібаў і посьпехі калгасаў у правядзеньні сяўбы бясспрэчна яшчэ больш павялічаць гэты прыліў. Тут патрэбна паставіць пытаньне аб кадрах для калгаснага будаўніцтва.

Тав. **Гурло** ў сваёй прамове канстатаваў, што Цэнтральны Камітэт праводзіў непрымірымую барацьбу з усялякімі адхіленьнямі ад генэральнай лініі партыі. Потым прамоўца спыніўся на недахопах у падрыхтоўцы кадраў. Тав. Гурло сказаў, што ў праграмах ВНУ ёсьць пэўны разрыў паміж тэарытычнай вучобай і практычнай падрыхтоўкай.

Тав. **Чорны** падкрэсьліў, што ў рэзультаце бальшавіцкага кіраўніцтва з боку ЦК КП(б)Б мы дабіліся вялікіх посьпехаў на ўсіх франтох і вучастках сацыялістычнага будаўніцтва.

Пераходзячы да пытаньняў работы прамысловасьці, т. Чорны спыняецца на прарывах у выкананьні прамфінпляну. Асобныя партыйныя арганізацыі ня здолелі мабілізаваць рабочую масу на барацьбу за прамфінплян, ня здолелі стаць на чале творчай актыўнасьці рабочых. Гэта зьяўляецца адной з асноўных прычын прарываў у выкананьні прамфінпляну. Канкрэтна тав. Чорны гаварыў аб прарывах на фабрыцы **«Чырвоная Бярэзіна»**.

З вялікай прамовай выступіў у спрэчках тав. **Будзінскі**. Тав. Будзінскі падкрэсьліў, што КП(б)Б і яе бальшавіцкі ЦК падыходзяць да свайго XIII зьезду пад знакам вялікіх дасягненьняў. Аб гэтых дасягненьнях мы павінны гаварыць, каб хутчэй ліквідаваць недахопы і памылкі, меўшыя месца ў рабоце асобных таварышоў і арганізацый, каб пасьпяхова ісьці наперад.

Потым т. Будзінскі перайшоў да пытаньняў барацьбы з нацыянал - дэмакратызмам. Было-б памылкай, сказаў прамоўца, гаварыць, што нацыянал-дэмакратызм разьбіты да канца, што барацьба з нацыянал - дэмакратызмам скончана. Тав. Будзінскі падкрэсьлівае, што ў барацьбе з нацыянал-дэмакратызмам мы дабіліся рашаючых посьпехаў. Партыя бязьлітасна выкрывала і выкрывае нацыянал - апартуністых і нацыянал - дэмакратаў. Партыйныя масы павінны сваячасова даваць жорсткі адпор усялякім пралуленьням нацыянал-апартунізму і нацыянал - дэмакратызму.

Закранаючы пытаньне гаспадарчага будаўніцтва, т. Будзінскі адначае рад вялікіх дасягненьняў партыі і рабочае клясы на гэтым фронце.—У барацьбу за выкананьне прамфінпляну, падкрэсьліў прамоўца, уцягнута ўся рабочая маса, гэта барацьба стала барацьбой рабочых мас.

У калгасным будаўніцтве, сказаў далей тав. Будзінскі, ня гледзячы на асобныя памылкі, якія мы прызнаём, па-бальшавіцку крытыкуем і выпраўляем, мы маем 13 проц. калектывізаваных бядняцка - серадняцкіх гаспадарак. Калектывізаваная плошча дасягае 18 проц.

Тав. **Харытонаў** завастрыў увагу канфэрэнцыі на задачах барацьбы з усялякімі ўхіламі ад лініі партыі, як з правым ухілам—галоўнай небясьпекай, так і з «левымі» загібшчыкамі.

Далей выступалі т. т. **Шульман, Хоніч, Вайновіч.**

Ранішняе пасяджэньне

На ранішнім пасяджэньні 20 мая працягваліся спрэчкі па дакладу ЦК КП(б)Б.

— КП(б)Б пад кіраўніцтвам ЦК дала рашучы адпор праўленьням правага ўхілу ў напрабоце, гаворыць т. **Альтман.**

Далей т. Альтман спыняецца на тым, што рэарганізацыя партыйнага апарату і ў сувязі з гэтым ліквідацыя нацыянальных бюро пры ЦК і акругкомах выклікалі ў некаторых камітэтах і ў асобных партыйцаў няправільнае разуменьне гэтай рэарганізацыі. Некаторыя таварышы меркавалі, што з ліквідацыяй нацбюро можна аб рабоце сярод нацыянальных меншасьцяй і ня думаць.

— Гэта таварышы няправільна. Мы з ліквідацыяй нацбюро павінны ў той-жа час узмацніць нацыянальную работу па лініі прафсаюзаў, па савецкай лініі і г. д. Ня ўсюды гэта робіцца. Таксама ёсьць многа недахопаў у пытаньнях работы ў мясцэчках. ЦК, па маёй думцы, павінен зьвярнуць на гэта сур'ёзную ўвагу.

— Пытаньні сваячасовага забесьпячэньня прамысловасьці сырцом і матар'ялам зьяўляліся і зьяўляюцца актуальнейшымі. Правільнае кіраўніцтва ЦК у гэтай галіне прывяло нашу рэспубліку да вялікіх дасягненьняў. Але ёсьць яшчэ асобныя арганізацыі, якія недапушчальна адносяцца да выкананьня дырэктыў партыі і зварачаюць невыстарчальную ўвагу на забесьпячэньне прадпрыемстваў і калгасаў. Да такіх арганізацый можна адпесьці Скуртрэст. З прычыны дрэннага забесьпячэньня, гаворыць т. Голан, — менская абутковая фабрыка страціла звыш 300 рабочых дзён.

— Я лічу, заявіў т. Голан, што дапускаць такое галавацяпства і страту рабочага часу злачынна.

Тав. **Маўчанскі** ў сваім выступленьні спыняецца на пытаньнях забесьпячэньня саўгасаў і калгасаў. Ён сказаў, што Белсельтрэст несваячасова забясьпечыў цэлы рад калгасаў патрэбнымі будаўнічымі матар'яламі.

Арганізацыі, якія ня выконваюць дырэктыў ЦК у гэтай галіне, павінны безадкладна выправіць гэты прарыў. Дырэктывы ЦК павінны быць поўнасьцю выкананы.

Тав. **Хамко**, адзначаючы правільную палітычную лінію ЦК, гаварыў аб пытаньнях будаўніцтва. Ён сказаў, што будаўнічыя арганізацыі невыстарчальна кіруюць будаўніцтвам, што гэтаму пытаньню аддаецца слабая ўвага.

Т. т. **Ліц і Майсейчык** у сваіх выступленьнях гаварылі аб калгасным будаўніцтве, аб тым, што асобныя партработнікі яшчэ да гэтага часу не жадаюць прызнаваць сваіх памылак, чым бясспрэчна дапамагаюць клясараму ворагу.

Потым прамоўцы падкрэсьлілі, што ЦК правільна па-бальшавіцку мабілізаваў партыйныя масы на ліквідацыю памылак і недахопаў, дапушчаных у радзе месц у калгасным будаўніцтве.

— ЦК КП(б)Б і пад яго кіраўніцтвам уся КП(б)Б праводзілі цьвёрдую лінію ў барацьбе з правым апартунізмам, з «левымі» загібамі і прымірэнчымі адносінамі да іх. Адначасова праведзена вялізарная работа па выкрыцьці нацыянал-апартунізму і нацыянал-дэмакратызму гаворыць т. **Бачароў.**

Значнае месца ў спрэчках па дакладу заняло пытаньне аб беларусізацыі. Дэлегацыі канфэрэнцыі падкрэсьлілі неабходнасьць рашучага ўзмацненьня беларусізацыі.

Затым у спрэчках выступалі т. т. **Налівайка, Бэйлін, Рай, Мэеровіч.**

Пасьля спрэчак выступіў спаткан

НАПЯРЭДАДНІ XIII ЗЬЕЗДУ КП(б)Б

ДА XIII ЗЬЕЗДУ КП(б)Б

Нацыянальнае пытаньне ў БССР і барацьба з нацыянал-дэмакратызмам і шавінізмам

Бурнае сацыялістычнае будаўніцтва БССР, як і ва ўсім Саюзе, праходзіць ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы. Побач з контр - рэвалюцыйнай актыўнасьцю кулацкіх і нэпманскіх элемэнтаў на эканамічным фронце мае месца актывізацыя варожых нам сіл на фронце ідэалёгічным, на фронце нацыянальна - культурным. На цягу 1929 г. па ўсёй Беларусі меў месца рад антысэміцкіх выступленьняў (справа Баршай і інш.). За гэты-ж пэрыяд значна ўзмацнілася актыўнасьць шавіністычных элемэнтаў. Мы мелі цэлы рад вылазак вялікадзяржаўнага шавінізму, шавінізму яўрэйскага і асабліва беларускага нацыянал - дэмакратызму. Партыя заўсёды вяла бязьлітасную барацьбу з шавінізмам вялікарускім, беларускім, яўрэйскім, польскім і інш. Але бываюць пэрыяды, калі той ці іншы шавінізм зьяўляецца найбольш актыўным і таму найбольш небясьпечным.

Ва ўмовах Беларусі найбольш небясьпечным на даным этапе зьяўляецца беларускі нацыянал - дэмакратызм, паколькі ён, па-першае, мае больш шырокую базу—кулацкая праслойка беларускае вёскі — і, па-другое, паколькі ён цесна зьвязан і фактычна зьяўляецца агентурай нацыянал - фашысцкіх элемэнтаў Заходняй Беларусі і Польшчы, элемэнтаў, якія ядуць узмоцненую падрыхтоўку да ўзброенага нападу на Савецкі Саюз і ў першую чаргу на заходні фарпост Саюзу — БССР.

Беларускі нацыянал - дэмакратызм, праводзячы сваю контр - рэвалюцыйную работу ціхай сапай у адбудоўчы пэрыяд, паколькі ён жыў тады надзеямі на перараджэньне савецкае ўлады, пачаў актыўна супраціўляцца ўсім мерапрыемствам па сацыялістычнай рэканструкцыі гаспадаркі, па выкарчоўваньні капіталістычных элемэнтаў на даным этапе нашага будаўніцтва.

Пэлытыка былога наркамзему БССР Прыщэпава з яго стаўкай на кулака, на хутарскую гаспадарку цалкам адпавядала чаканьням і надзеям нацыянал-дэмакратаў на капіталістычнае перараджэньне БССР. Гэта палітыка знайшла сваё тэарытычнае ўгрунтаваньне ў працах вучоных нацыянал - дэмакратаў, як напрыклад, праф. Кісьлякова, які даводзіў гаспадарчую мэтазгоднасьць на Беларусі дробнага пасёлку, на сутнасьці хутара. Гэта кулацкая палітыка наркамзему знайшла сваё мастацкае адлюстраваньне і ў беларускай літаратуры. Пісьменьнік М. Зарэцкі ў нарысе «Вандраваньне на новую зямлю» марыць аб пабудове на мэліяраваных беларускіх балотах такіх сялянскіх гаспадарак, якія-б былі падобны да гаспадаркі нямецкага фэрмэра.

Маючы сваіх агентаў у галіне гаспадарчага будаўніцтва, асабліва па лініі сельскай гаспадаркі, беларускія нацыянал - дэмакраты імкнуліся заўладаць пазыцыямі і на нацыянальна - культурным фронце, што пры амаль зусім поўнай адсутнасьці пралетарскіх культурных кадраў і пры невыстарчальнай пільнасьці, ім у значнай меры ўдавалася. Асаблівую ўвагу нацыянал-дэмакраты зварачалі на заваяваньне кадраў маладых культурных работнікаў, галоўным чынам літаратурнага маладняка. Адгэтуль зразумела, што найбольшыя праявы нацыянал - дэмакратычных тэндэнцый мы сустракаем у галіне мастацкае творчасьці.

Гэта не перашкаджала нацыянал - дэмакратам скарыстоўваць і галіну чыстае навукі, як лінгвістыка, геаграфія і навукі грамадзкія. Аўтар геаграфіі Беларусі ўключыў у тэрыторыю Беларусі большую частку сучаснае Заходняй вобласьці, даючы прадрыстыя намёкі на тое, што пад чужым уладаньнем знаходзіцца ня толькі Заходняя Беларусь, але і частка Беларусі Ўсходняй.

Праф. Доўнар - Запольскі ў гісторыка-эканамічнай працы (не апублікаванай) імкнуўся даць тэарэтычнае ўгрунтаваньне беларускаму нацыянал - дэмакратызму, даводзячы, што на тэрыторыі Беларусі ў Кастрычніку мела месца толькі аграрная рэвалюцыя, і што Беларусь, як краіна пераважна сялянская, павінна мець дыктатуру сялян і рабочых. Падобныя размовы мы сустракаем і ў раду беларускіх нацыянал-апартуністых.

У галіне мастацкай літаратуры за апошнія два гады зьявіўся рад твораў яўна з нацыянал - дэмакратычнымі тэндэнцыямі, як «Вецер з Усходу» Т. Глыбоцкага, «Камісары» Ц. Гартнага, «Лісты да сабакі» і інш. паэмы Я. Пушчы. Некаторыя творы Ўл. Дубоўкі, «Падарожжа на новую зямлю» і роман «Крывічы» Зарэцкага. Мы прапускаем рад іншых больш дробных пісьменьнікаў. З першага апублікаванага разьдзелу раману «Крывічы» можна зрабіць вывад, што мы маем спробу капіяваць «Вальдшнэпаў» Хвлёвага. Раман «Крывічы» сваім зьместам зьяўляецца апатэозам беларускага нацыянал - шавінізму.

Найбольш яскрава беларускі нацыянал-дэмакратызм выявіўся ў тэатральнай дыскусіі мінулага году і ў ня гэтак даўно моўнай месца ў БАН дыскусіі аб шляхох беларускае літаратурнае мовы. Апошняя дыскусія выявіла ў значнэ больш выпуклай форме тыя-ж моманты, якія былі характэрны і для тэатральнай дыскусіі. Паколькі ў апошняй дыскусіі мела месца і выступленьне вялікадзяржаўных расійскіх шавіністых і беларускіх нацыянал - дэмакратаў, настолькі на ёй патрэбна спыніцца. Па сутнасьці выступленьні беларускіх нацыянал - дэмакратаў і вялікадзяржаўных шавіністых зьявіліся аб'яднанай атакай супроць лініі партыі ў нацыянальным пытаньні, у прыватнасьці супроць беларусізацыі.

Дацэнт БДУ, Воўк - Леваповіч, прабаваў зьвесьці беларускую мову да простай гаворкі, якая зьяўляецца адным з разгаліненьняў расійскай мовы, маскуючы сваю вялікадзяржаўную сутнасьць заявамі аб тым, што ён не за расійскія, польскія і іншыя словы ў беларускай мове, а за чыстую нібыта беларускую мову. В. - Левановіч прабуе замяніць цэлы рад беларускіх слоў расійскімі, прапануе выкінуць з беларускае мовы словы, якія сустракаюцца ў іншых мовах. Гэта рабілася з тэй мэтай, каб давесьці, што беларускай мовы наогул ня існуе, ёсьць толькі жаргон з розных моваў, «гаворка», «наречие». Адначасова В.-Левановіч, як і ўсе вялікадзяржаўныя шавіністыя, зьнімае праблему нацыянальнага прыгнечаньня і прымусовай русыфікацыі па тэрыторыі былое царскае імпэрыі, зводзячы русыфікатарскую царскую палітыку да «арганічных натуральных працэсаў набліжэньня беларускае і расійскае мовы».

Вялікадзяржаўны расійскі шавінізм зьяўляецца сьмяротным ворагам інтэрнацыянальнай салідарнасьці працоўных і пашырае нацыянальную нянавісьць і абмежаванасьць. Гэта знайшло адбітак у тэзісах В. - Леваповіча, у якіх праводзіцца думка, быццам усе ўплывы польскай мовы на беларускую мову паходзяць выключна ад прынятальніцкіх колаў. Клясавы падзел ён падмяняе цалкам падзелам паводле прынцыпу нацыі і веравызнаньня. З аднаго боку, ён бачыць каталіцка - польскі лягер, — г. зн. кулацтва, абшарніцтва, пляхецтва, з другога боку — праваслаўна-рускі лягер, г. зн. сялянства і інш. прыгнечаныя. Гэтае процістаўленьне клясавага падзелу — падзелу па лініі нацыі і веравызнаньня зьяўляецца выразам пя толькі вялікадзяржаўнага расійскага шавінізму, але і контр - рэвалюцыйнай праявай кожнага шавінізму наогул.

З боку беларускіх нацыянал - дэмакратаў у дыскусіі аб мове яшчэ больш яскрава, чымся ў тэатральнай дыскусіі, выявіліся тэорыі «самабытнасьці» беларускае культуры і мовы. Беларускі нацыянал - дэмакратызм, падобна украінскаму, праводзіў лінію за «чыстату мовы» (пурызм). У аснову мовы прапануецца браць мову найбольш адсталай часткі беларускага сялянства. На справе гэта пурыстычная лінія зводзілася да барацьбы з саветызмамі, да барацьбы з інтэрнацыяналізмамі ў галіне мовы. Складальнікі беларускай тэрміналёгіі, напрыклад, замест інтэрнацыянальнага слова «эксплёатацыя» ўжывалі за лепшае польскае слова «вызыск». Адначасова ўсяляк унікаецца запазычаньне слоў з расійскага лексыкону. «Тэорыя самабытнасьці» і арыентацыя па «культурны» захад, у даным выпадку на фашысцкую пакуль што Варшаву, замест чырвонай Масквы, — зьяўляюцца найбольш характэрнымі рысамі беларускага нацыянал - дэмакратызму.

Трэцяй характэрнай рысай беларускага нацыянал - дэмакратызму зьяўляецца ўстаноўка аб бясклясавасьці беларускае нацыі. На Беларусі, моў, ня было ні паноў, ні буржуазіі, было толькі прыгнечанае беднае сялянства. Тут хаваецца крыніца ідэалізацыі народніцкіх партый, як беларуская сацыялістычная грамада і інш.

У дыскусіі яскрава выявілася адмаўленьне вядучай ролі пралетарыяту ў культурным будаўніцтве. Праводзілася тая думка, што беларускі пралетарыят пры правядзеньні беларусізацыі павінен толькі пасыўна ўспрыймаць беларускую мову, што ён зьяўляецца толькі спажыўцом мовы, але ня творцам яе.

У радох КП(б)Б сярод найменш устойлівых членаў партыі нацыянал - дэмакраты знайшлі свой рупар, знайшлі посьбітаўцу ідэй нацыянал - дэмакратызму. Праява нацыянал - дэмакратычных тэндэнцый у радох партыі, нацыянал-апартунізм зьяўляецца адным з элемэнтаў правага ўхілу ва ўмовах нацыянальнай рэспублікі. КП(б)Б нанесла рашаючы ўдар нацыянал - дэмакратам і нацыянал - апартуністым. Уся КП(б)Б была мабілізавана на барацьбу з беларускім нацыянал - дэмакратызмам, як найбольш небясьпечным, на барацьбу з шавінізмамі іншых колераў.

Паралельна з актывізацыяй беларускіх нацыянал - дэмакратаў ішла і актывізацыя яўрэйскіх шавіністых. Даволі пашыранай зьявай сярод некаторай часткі яўрэйскіх і польскіх працоўных зьяўляецца нацыянальная абмежаванасьць, калі нават на прадпрыемстве яўрэі групуюцца з яўрэямі, палякі з палякамі. Яшчэ ня рэдка чуваць «гой», «гоіша коп» з боку яўрэяў у адносінах да чалавека іншай нацыянальнасьці. Нацыянальная абмежаванасьць асабліва рэзка праяўлялася ў працэсе інтэрнацыяналізацыі прадпрыемстваў, калі на беларусоў - рабочых, якія ўліваліся на фабрыку, дзе пераважную большасьць складалі яўрэйскія рабочыя, некаторая частка яўрэйскіх рабочых глядзела, як на чужых прышляцоў (Дубровенская Мануфактура, швэйная прамысловасьць).

У галіне гаспадарчага будаўніцтва яўрэйскія нацыяналісты і нацыянал-апартуністыя праводзілі работу пад лёзунгам «уцягнуць усіх яўрэяў у сацыялізм». Адгэтуль скажэньне клясавай лініі ў рабоце саматужна - прамысловай каапэрацыі БССР. Яўбюро ЦК КП(б)Б і былыя працаўнікі саматужна-прамысловай каапэрацыі далі ўстаноўку на ўцягненьне ў саматужна - прамысловую каапэрацыю былых гандляроў «у мэтах скарыстаньня іх ініцыятывы і сродкаў». У галіне гістарычнай навукі яўрэйскімі нацыяналістымі культывуецца думка аб адзінай яўрэйскай нацыі, якую заўсёды ўціскалі, прасьледвалі, культывуецца тое палажэньне, што з боку яўрэяў ня было фактаў эксплёатацыі, прыгнечаньня. Адначасова з гэтым прапаведуецца, што яўрэйскі нацыяналізм зьяўляецца адказам на антысэмітызм, а ня вынікам, як і самы антысэмітызм, клясавай барацьбы.

У галіне лінгвістыкі праводзіцца тая-ж работа па барацьбе з саветызмамі і інтэрнацыяналізмамі яўрэйскай тэрміналёгіі, аддаецца перавага тэрмінам з старажытна - яўрэйскай мовы.

Сваю работу яўрэйскія нацыяналісты праводзяць у цесным саюзе з яўрэйскімі клерыкаламі. Сынагога стала цэнтрам шавіністычнай дзейнасьці сярод яўрэйскіх працоўных.

Побач з ідэалізацыяй беларускай грамады ў беларускіх нацыянал - апартуністых, мае месца ідэалізацыя дробнабуржуазных яўрэйскіх партый — Бунду і інш. — сярод яўрэйскіх нацыянал-апартуністых.

Удар партыі па беларускім нацыянал-дэмакратызьме даў повад узьняць галаву вялікадзяржаўнаму расійскаму шавінізму.

Аднэй з форм праяўленьня вялікадзяржаўнага шавінізму зьяўляецца высоўваньне пераважнай ролі расійскай культуры, зьніжэньне або нават адмаўленьне беларускай культуры.

Гэтым вялікарасійскі шавіністы імкнецца скрыта або адкрыта ўхіліцца ад выкананьня дырэктывы партыі па ажыцьцяўленьні на справе беларусізацыі.

Між тым — «ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы беларусізацыя зьяўляецца адным з асноўных сродкаў па ажыцьцяўленьні кіруючай ролі пралетарыяту асноўнымі масамі сялянства, была і застанецца магутнай зброяй у барацьбе з беларускім нацыянал-дэмакратызмам, расійскім і іншым шавінізмам» (з пастановы Бюро ЦК КП(б)Б).

Ня гледзячы на тое, што ў галіне беларусізацыі мы маем у БССР вялізарныя посьпехі на паасобных вучастках, у паасобных апаратах савецкіх, прафсаюзных, каапэрацыйных і гаспадарчых устаноў ёсьць прарывы ў адносінах беларусізацыі, як вынік неразуменьня палітычнага значэньня беларусізацыі.

«Наглядаецца рад выпадкаў фармальных адносін да беларусізацыі, пасыўнае супраціўленьне і нават паасобныя выпадкі адкрытых выступленьняў супроць беларусізацыі» (з пастановы ЦК КП(б)Б).

Апрача памянёнага вышэй праяўленьня вялікарасійскага шавінізму — адкрытага выступленьня некалькіх камуністых у Бабруйску, мы маем яскравы выпадак таго-ж парадку з боку беспартыйнага прафэсара БДУ — Шчапоцьцева. Гэты прафэсар, прапрацаваўшы ў БССР пяць год, падаў заяву ў праўленьне БДУ аб аслабаненьні яго ад абавязкаў прафэсара біялёгіі і заалёгіі бясхрыбетных. Сваю просьбу праф. Шчапоцьцеў матывуе так (заява аб выходзе) — «прадстаячая беларусізацыя маёй катэдры (пастанова праўленьня, прат. № 21), незнаёмства з беларускай мовай і немагчымасьць чытаць лекцыі на замежнай мове (хоць-бы я яе і разумеў)». (З заявы праф. Шчапоцьцева А. С. у праўленьне БДУ). Шчапоцьцеў прапрацаваў у БССР 5 год. Ён разумее беларускую мову, але чытаць лекцыі на гэтай «замежнай мове» ён лічыць для сябе немагчымым, відаць, таму, што аддае перавагу расійскай культуры над культурай беларускай.

Другі прафэсар з сельска - гаспадарчай акадэміі ў аднэй са сваіх заяў піша: «У нас ёсьць толькі беларускі шавінізм і з ім патрэбна ўсямерна змагацца. У с.-г. акадэміі ніколі ніякага вялікадзяржаўнага шавінізму ня было і няма». Праф. Афанасьсеў, здаючы свой рукапіс у друк, кажа: «Вельмі прашу мой артыкул надрукаваць на расійскай, ленінскай мове». Студэнт Горацкага рабфаку ў ананімнай анкеце піша наступнае: «па беларусізацыі сацыялізму не пабудуеш і няма чаго ёй асабліва займацца». Выкладчык таго-ж рабфаку Цяньцюкоў на прапанову весьці выкладаньне на беларускай мове адказаў: «беларуская мова штучная, гэта выдумка беларускіх шавіністых, дый сама Беларусь ёсьць «белая Русь», ёсьць Расія і ніякай асаблівай мовы яна ня мае». «Мужыцкая мова», «штучная мова» так заяўлялі некаторыя камсамольцы Віцебскага чыгуначнага вузла. Гэтыя прыклады пасыўнага і актыўнага супраціўленьня правядзеньню беларусізацыі можна-б было памножыць.

Досыць пашыранае пасыўнае супраціўленьне беларусізацыі, факты актыўнага супраціўленьня зьяўляюцца нічым іншым, як праявай вялікадзяржаўнага расійскага шавінізму.

За невыкананьне дырэктывы партыі і ўраду па беларусізацыі ўвосень 1919 г. зьнят з работы рад кіруючых працаўнікоў савецкага, гаспадарчага і прафсаюзнага апаратаў. На рад работнікаў, членаў партыі, пакладзены партыйныя спагнаньні.

Як-жа КП(б)Б, у мэтах адхіленьня асноўных перашкод у справе правядзеньня нацыянальтыкі, вядзе барацьбу з нацыянал - дэмакратызмам і праявамі антысэмітызму? Інтэрнацыяналізацыя прадпрыемстваў і ўстаноў зьяўляецца адным са сродкаў гэтай барацьбы. На жаль, ня ўсюды дырэктыва партыі аб інтэрнацыяналізацыі прадпрыемстваў праводзіцца ў жыцьцё. Слаба пасоўваецца інтэрнацыяналізацыя швэйнай, гарбарнай і паліграфічнай прамысловасьці, дзе ў пераважнай масе былі заняты яўрэйскія рабочыя.

Злачынна слаба праводзіцца інтэрнацыяналізацыя транспарту і сувязі, асабліва за лік укараненьня туды яўрэйскіх рабочых.

Арабочаньне савецкага, гаспадарчага, прафэсыянальнага і іншых апаратаў зьяўляецца таксама адным з важнейшых спосабаў барацьбы з шавінізмам. Трэба сказаць, што арабочаньне апарату праводзіцца даволі слаба, асабліва за лік кадраў беларускіх рабочых, якія складаюць значную большасьць у адносінах процанту рабочых іншых нацыянальнасьцяй. Калі ў савецкіх, прафэсыянальных і партыйных апаратах беларусы наогул і беларусы - рабочыя складаюць значны процант, дык гэтага нельга сказаць аб гаспадарчых органах, як ВСНГ і каапэрацыя.

Беларусізацыя савецкага, партыйнага, прафэсыянальнага апарату, на аснове добраахвотнасьці рабочай клясы БССР, складаючы адно з зьвеньняў змычкі з асноўнымі масамі беларускага сялянства, у той-жа час зьяўляецца магутнай зброяй партыі ў барацьбе з беларускім нацыянал - дэмакратызмам і шавінізмам іншых колераў. Як ужо адзначалася вышэй, пры вялізарных дасягненьнях у галіне беларусізацыі, у некаторых праслойках наглядаецца яшчэ значнае пасыўнае і актыўнае супраціўленьне правядзеньню беларусізацыі.

Інтэрнацыянальнае выхаваньне пралетарыяту зьяўляецца адным з асноўных сродкаў у барацьбе з шавінізмам, у барацьбе з антысэмітызмам. Трэба прызнаць, што гэта работа не пастаўлена на належную вышыню, што яна вядзецца несыстэматычна, ня глыбока. У сувязі з гэтым асаблівае значэньне набывае работа сярод нацменшасьцяй на іх роднай мове. Аб тым, як дрэнна вядзецца гэта работа, красамоўна кажуць наступныя лічбы: «У рабочых клюбах масавая работа праводзіцца на 21,6 проц. на беларускай мове, 4,8 проц. на яўрэйскай, 0,4 проц. на польскай і 73 проц. на расійскай мове. На прадпрыемствах масавая работа праводзіцца на беларускай мове 27,4 проц., яўрэйскай — 2,2 проц., польскай — 0,2 проц., на расійскай — 50,2 проц.» (паводле даных Культаддзелу ЦСПСБ). І гэта ў той час, калі пераважная большасьць складаецца з беларусоў - рабочых, ёсьць вялікі процант яўрэйскіх рабочых, а таксама і рабочых польскай нацыянальнасьці.

Перад усёй КП(б)Б стаяць задачы ўзмацніць работу па інтэрнацыянальным выхаваньні пралетарскіх мас, паставіць на належную вышыню абслугоўваньне і палітыка - асьветную работу сярод нацыянальных меншасьцяй на іх роднай мове.

Вялізарнейшае значэньне ў барацьбе з нацыянал - дэмакратызмам і шавінізмам набывае пытаньне пралетарскіх кадраў на фронце культурнага будаўніцтва. Бюро ЦК КП(б)Б зьняло былое кіраўніцтва Наркамасьветы за яго права - апартуністычную палітыку ў пытаньні аб кадрах, за яго прыміранчыя адносіны да вылазак нацыянал - дэмакратаў.

Ня гледзячы на рад дырэктыў і пленумаў ЦК УсеКП(б) і пленумаў ЦК КП(б)Б па пытаньні аб кадрах, студзеньскі пленум ЦК КП(б)Б павінен быў канстатаваць, «што яшчэ да сучаснага моманту няма пералому ў адносінах узмацненьня работы па падрыхтоўцы кадраў», а з боку раду важнейшых арганізацый наглядаецца яшчэ некаторая недаацэнка палітычнага значэньня «праблемы кадраў». Уся ўвага партарганізацыі павінна быць завострана на выкананьні гэтай важнейшай дырэктывы партыі.

У галіне літаратуры, тэатру, мастацтва асаблівае значэньне набывае ўзмацненьне пралетарскага ядра ў літаратурных арганізацыях. Барацьба за гегемонію пралетарскай літаратуры — ёсьць частка барацьбы за культуру, нацыянальную па форме, пралетарскую па зьмесьце. Выхаваньне пралетарскіх пісьменьнікаў, узмацненьне і ўсямерная садзейнасьць БелАПП'у пры адначасовым падтрыманьні і прыцягненьні найбольш блізкіх нам пісьменьнікаў в іншых літаратурных арганізацый складае адну з асноўных задач на даным этапе.

Праводзячы рашучую барацьбу в нацыянал - дэмакратызмам і нацыянал-апартунізмам шляхам шырокага выкрыцьця контр - рэвалюцыйнай сутнасьці нацыянал - дэмакратызму, шляхам мабілізацыі партыйнай грамадзкасьці на барацьбу з ім, партыя мабілізавала на гэту барацьбу і камсамольскія масы.

Новае кіраўніцтва ЦК ЛКСМБ пры правядзеньні трохмесячніка беларускай нацыянальнай культуры і культуры нацыянальных меншасьцяй мабілізавала ўвагу камсамольскай арганізацыі па пытаньнях барацьбы з нацыянал - дэмакратызмам і шавінізмам.

У выніку мы мелі паласу прызнаньняў з боку нацыянал - апартуністых (Чарвякоў, Жылуновіч, Бэйлін і інш.) і нацыянал - дэмакратаў і вялікадзяржаўных шавіністых (акадэмік Лёсік, Некрашэвіч, дац. В.-Левановіч і інш.). Літаратурная арганізацыя «Узвышша» прызнала наяўнасьць нацыянал - дэмакратычных тэндэнцый у творчасьці як цэлага раду пісьменьнікаў гэтага літаратурнага аб'яднаньня, так і арганізацыі ў цэлым. Рад нацыянал - апартуністых, якія ўпарта не прызнавалі сваіх памылак, выключан з партыі. Сёньня мы ўжо ня маем адкрытых выступленьняў нацыянал - дэмакратаў. Але гэта не азначае, што вораг разьбіты. Вораг прытаіўся. Партыя і рабочая кляса павінны захаваць належную пільнасьць.

Праводзячы бязьлітасную барацьбу в правым ухілам, як найбольш небясьпечным, і «левымі» загібамі, вядучы барацьбу з нацыянал - апартунізмам, беларускім нацыянал - дэмакратызмам за ленінскую лінію ў нацыянальным пытаньні, КП(б)Б прыдзе згуртаванымі сталёвымі радамі вакол ленінскага ЦК УсеКП(б) да 16 зьезду.

А. СЯНКЕВІЧ.

РАБОЧЫЯ МЕНСКІХ ФАБРЫК І ЗАВОДАЎ ВІТАЮЦЬ АКРУГОВУЮ ПАРТКАНФЭРЭНЦЫЮ. НА ЗДЫМКУ: ШМАТТЫСЯЧНАЯ ДЭМАНСТРАЦЫЯ ЛЯ КЛЮБУ ІМЯ КАРЛА МАРКСА

На партканфэрэнцыях

МЕНСК

Скончылася **Барысаўская** раённая партканфэрэнцыя. Канфэрэнцыя актыўна абмеркавала даклад Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б, зроблены т. **Грысевічам.** Дэлегаты канфэрэнцыі аднадушна канстатавалі, што Цэнтральны Камітэт КП(б)Б цьвёрда і няўхільна праводзіў генэральную лінію партыі. Пасьля заключнай прамовы т. Грысевіча канфэрэнцыя заслухала даклад Менскага АК КП(б)Б.

Дакладчык т. **Камэнштэйн** падкрэсьліў, што Менскі АК непрымірыма змагаўся на два фронты, як з правым ухілам—галоўнай небясьпекай, так і з «левымі» загібамі, з рэшткамі контр-рэвалюцыйнага трацкізму. Тав. Камэнштэйн адзначыў, што Менская акруговая арганізацыя дабілася бясспрэчных посьпехаў у калгасным будаўніцтве. Энэргічна і рашуча выпраўляючы дапушчаныя асобныя памылкі і скрыўленьні, якія Менскі АК па-бальшавіцку прызнаў і асудзіў, партыйная арганізацыя, пад кіраўніцтвам ЦК, выканае пастаўленыя перад ёю задачы па калгасным будаўніцтве, па ліквідацыі кулацтва, як клясы, у раёнах суцэльнай калектывізацыі.

Дакладчык асабліва падкрэсьліў задачу барацьбы за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

Па дакладу т. Камэнштэйна выказалася звыш 20 чал. Канфэрэнцыя прызнала палітычную лінію Менскага акруговага камітэту партыі правільнай.

Канфэрэнцыя паслала прывітальныя тэлеграмы ЦК УсеКП(б), ЦК і Мен. АК КП(б)Б, ЦК КП Польшчы і Заходняй Беларусі і газэтам **«Правда» і «Зьвязда».** Работа раённай канфэрэнцыі была скончана правядзеньнем выбараў кіраўнічых органаў Барысаўскай партарганізацыі. Першы пленум новага РК КП(б)Б абраў сакратаром раённага камітэту т. **Сасноўскага.**

БАБРУЙСК

Скончыліся раённыя партыйныя канфэрэнцыі Бабруйскай арганізацыі. Канфэрэнцыі прайшлі на аснове шырока разгорнутай самакрытыкі. Канфэрэнцыі аднадушна ўхвалілі палітычную лінію акруговага камітэту партыі і завастрылі ўвагу на хутчэйшым выпраўленьні памылак, дапушчаных у асобных мясцох у калгасным будаўніцтве.

ВІЦЕБСК

У сувязі з акруговай партыйнай канфэрэнцыяй адбыліся сходы раённых партарганізацый. На куставым сходзе 2-й віцебскай гарадзкой арганізацыі КП(б)Б выступіў сакратар АК КП(б)Б т. Чычэраў з дакладам аб рабоце акругкому.

Тав. Чычэраў падкрэсьліў, што акруговая партарганізацыя за час ад мінулай партыйнай канфэрэнцыі праводзіла сваю работу на аснове генэральнай лініі партыі. Віцебская партарганізацыя, заявіў дакладчык, рашуча ўдарыла па канкрэтных праявах праваапартуністычнай практыкі, па вылазках вялікадзяржаўнага шавінізму, па антысэмітызьме. Тав. Чычэраў падкрэсьліў, што партыйная арганізацыя прышла да сваёй акруговай канфэрэнцыі пад знакам бясспрэчных дасягненьняў.

У акрузе пабудаваны і будуюцца новыя заводы і фабрыкі. Колькасьць рабочых у прамысловасьці вырасла на 30,7 проц.—Аднак, сказаў дакладчык, гэтыя посьпехі тым больш прымушаюць нас завастрыць увагу на недахопах і прарывах. Прамфінпляны на заводах і фабрыках акругі выкананы толькі на 96 проц.

Пераходзячы да пытаньняў калгаснага будаўніцтва т. Чычэраў адзначыў, што ў акрузе ў практыцы калгаснага руху былі дапушчаны сур'ёзныя памылкі і скажэньні. Акруговае парткіраўніцтва таксама дапусьціла некаторыя на мылкі. Бюро АК КП(б)Б прызнала і рашуча асудзіла гэтыя памылкі.

Раённы партсход актыўна абмеркаваў даклад т. Чычэрава. Удзельнікі сходу, адзначаючы асобныя недахопы ў рабоце акругкому, канстатавалі, што АК КП(б)Б праводзіў правільную палітычную лінію.

Карэнная задача

На аснове правільнай палітыкі партыі па калгасным будаўніцтве значна ўзрасла актыўнасьць асноўных мас сялянак. Вырас і ўзмацніўся ўдзел батрачак і бядняцка-серадняцкіх мас сялянак у сацыялістычнай перабудове вёскі. Масы батрачак, бяднячак і сераднячак прымаюць актыўны ўдзел у рабоце сельскіх саветаў, каапэрацыйных і грамадзкіх арганізацый на вёсцы.

За апошні год лік жанчын у складзе сельсаветаў павялічыўся з 7,2 проц. да 19,6 проц. У праўленьнях малочных таварыстваў у мінулым годзе было толькі 176 жанчын, зараз гэта лічба дасягае 861. У складзе КСУ колькасьць жанчын вырасла да 20 проц.; у праўленьнях калгасаў зараз ёсьць звыш 15 проц. калгаснік-батрачак, бяднячак і сераднячак.

Адзначаючы бясспрэчныя дасягненьні ў масавай рабоце сярод сялянак, мы тым больш павінны завастрыць увагу на слабых мясцох гэтае работы. Асобныя партыйныя арганізацыі недаацэньваюць ролі бядняцка-серадняцкіх мас сялянак у калгасным будаўніцтве і барацьбе за ліквідацыю кулацтва, як клясы, на аснове суцэльнай калектывізацыі.

Масавая работа часамі праводзілася «наогул сярод усіх жанчын». Гэтым змазаўся клясавы зьмест масавай работы сярод батрачак, бяднячак і сераднячак. У радзе месц не праводзіцца сыстэматычнай і гнькавай работы па клясавым палітычным выхаваньні асноўных мас сялянак. Адсутнасьць клясавага выхаваньня батрачак, бяднячак і сераднячак была толькі на руку кулаку, на руку клясаваму ворагу. Кулацтва скарыстоўвала памылкі і перагібы, дапушчаныя ў практыцы калгаснага руху, каб з'агітаваць адсталыя пласты сялянак супроць калектывізацыі..

Трэба проста сказаць, што асобныя партыйныя арганізацыі амаль не праводзяць ніякай работы сярод батрачак і бядняцка-серадняцкіх мас сялянак. Многія партыйныя арганізацыі ня выконваюць дырэктыў КП(б)Б аб рабоце сярод асноўных мас сялянак. У радзе месц зусім ня выконваюцца дырэктывы ЦК КП(б)Б аб правядзеньні асобнай работы сярод батрачак і бяднячак. Ня дзіва, што частка дэлегацкіх сходаў зусім не працуе. Асобныя дэлегацкія сходы развальваюцца. У Бабруйскай акрузе дэлегаткі калгаснага кусту імя Красіна знаходзяцца пад уплывам сэктантаў. У Гомельскай акрузе былі выпадкі, калі асобныя дэлегаткі выступалі ў абарону кулакоў.

Асобныя работнікі замест таго, каб разгарнуць масавую прапагандысцкую работу сярод асноўных мас сялянак, займаюцца пікоднымі разважаньнямі аб «агульнай рэакцыйнасьці сялянак». Такім разважаньням трэба даваць жорсткі і бязьлітасны адпор.

Факты і матар'ялы сьведчаць аб тым, што акругкомы КП(б)Б займаліся работай сярод жанчын, галоўным чынам, толькі ў часе кампаній (8-га саквіка, перавыбары дэлегатак і г. д.). **Гомельскі, Полацкі і Менскі** АК КП(б)Б за ўвесь 1929 год ні аднаго разу не абмеркавалі пытаньняў работы сярод калгасьніц. Пытаньні работы сярод саўгасных работніц і батрачак абмяркоўвалі толькі **Менскі, Аршанскі і Бабруйскі** акругкомы. Усё гэта сьведчыць аб тым, што на пытаньні работы з батрачкамі і бяднячкамі работніцамі саўгасаў і калгасьніцамі, на пытаньні арганізацыі жаночай працы і быту ў саўгасах і калгасах і г. д. зварачалася невыстарчальная ўвага.

Ня гледзячы на рэарганізацыю жанаддзелаў, якая мела на мэце ўзмацненьне работы сярод жанчын, на гэтым адказьнейшым вучастку мы яшчэ ня маем пералому. Мэтады парткіраўніцтва работай сярод жанчын засталіся старымі. Уся масавая работа сярод работніц, батрачак, бяднячак і сераднячак, як і раней, цалкам ускладаецца на адных жанарганізатараў.

Такое становішча недапушчальна. Карэннае ўзмацненьне работы сярод асноўных мас сялянак павінна стаць бавым цэнтральным лёзунгам партарганізацыі. Кожная партыйная арганізацыя павінна на справе мабілізаваць масы батрачак, бяднячак і сераднячак на барацьбу за калгаснае будаўніцтва, за гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, за ліквідацыю кулацтва, як клясы, у раёнах суцэльнай калектывізацыі.

У рабоце сярод жанчын на вёсцы трэба ўлічваць спэцыфічныя асаблівасьці працы ў калгасах, саўгасах і ў індывідуальным сэктары. Уся работа сярод батрачак і бяднячак, работа дэлегацкіх сходаў павінна будавацца ў адпаведнасьці з задачамі гаспадарчага замацаваньня калгасаў, арганізацыі працы і быту і г. д. Роля жанчын у разьвіцьці калгасаў БССР набывае асаблівае значэньне ў сувязі з пэрспэктывамі разьвіцьця калектыўных гаспадарак па лініі садова-агародніцтва, ільнярства, масларобства, жывёлагадоўлі і інш. У гэтых галінах гаспадаркі можа ўжывацца пераважна жаночая праца.

Дэлегацкія сходы на вёсцы і арганізацыя батрачак і бяднячак праз групы беднаты павінны стаць асноўнымі зьвеньнямі ў масавай рабоце сярод працоўных сялянак для ўцягненьня іх у калгасы і для мабілізацыі іх на рашучую барацьбу з кулацтвам.

Пры правядзеньні масавай работы сярод працоўных сялянак трэба ўлічваць нацыянальныя асаблівасьці, трэба няўхільна ўзмацняць інтэрнацыянальнае выхаваньне асноўных мас сялянак.

БУРАВА.

ТЭЗІСЫ — У МАСЫ

Тэзісы тав. Якаўлева на XVI зьезду УсеКП(б) — прапрацаваць на партсходах

Усім райкомам і ячэйкам КП(б)Б Менскай акрарганізацыі

У газэце **«Зьвязда»** № 116 (3 4) ад 20-V гэтага году надрукаваны тэзісы **тав. Якаўлева** да XVI зьезду УсеКП(б) **«Аб калгасным руху і ўмацненьне сельскай гаспадаркі».**

Акруговы камітэт прапануе на акруговых адкрытых партыйных схо[illegible] правесьці прапрацоўку гэтых тэзісаў.

Раённыя камітэты павінны вы[illegible]чыць дакладчыкаў на гэтыя сходы з [illegible] найбольш кваліфікаваных таварышаў.

У якасьці дадатковых матар'ялаў [illegible] дакладу скарыстайце артыкул т. [illegible]ліна «Головокружение от успехов» [illegible] «Ответ колхозникам».

Сакратар АК КП(б)Б СЛАВІНСКІ

Заг. Культпропу АК КП(б)Б КАМЭНШТЭЙН

На Бабруйскай акпартканфэрэнцыі

БАБРУЙСК, 20. Учора адкрылася VI акруговая канфэрэнцыя **Бабруйскай** арганізацыі КП(б)Б. Сакратар АК т. **Астапенка,** адкрываючы канфэрэнцыю, ва ўступнай прамове спыніўся на задачах, якія стаяць перад канфэрэнцыяй.

Канфэрэнцыя абрала ў прэзыдыум 21 чал., у тым ліку тав. **Гантман, т. Астапенку, т. Юргенсона.**

У ганаровы прэзыдыум канфэрэнц

Арганізацыя працы-асновакалгасу

Саўгасы і калгасы, скончыўшыя сяўбу, павінны дапамагчы адстаўшым калгасам і індывідуальнікам

Улічыўшы недахопы веснавой сяўбы, падрыхтавацца да уборачнай кампаніі

Раўняйцеся па калгасе імя Сталіна

Ён перавыканаў пасеўны пэян і пачаў падрыхтоўку да ўборкі ўраджаю

Калгас імя Сталіна (Самахвалавіцкі раён) скончыў сяўбу на 11 дзён раней тэрміну, вызначанага саветам калгасу. Плянавыя меркаваньні перавыкананы.

Зараз калгасная кузьня прыступае да рамонту ўборачнага інвэнтару. Прыступлена таксама да рамонту сялянскага інвэнтару.

Пры калгасе адкрыта сталярная майстэрня.

Усе калгасьнікі выяжджаюць на дапамогу эканамічна слабейшаму калгасу «Чырвоны Партызан».

За ўвесь час работы ў калгасе ня было ні аднаго прагулу.

З. БАКШТЭЙН.

Калгас «Чырвоны штандар», Полацкай акругі, Вульскага раёну, арганізаваў запашку кулацкіх зямель

СТО ПРЭМІЯ

За лепшае правядзеньне кантрактацыі азімых і яравых пасеваў

Для прэм'яваньня калектыўных гаспадарак, вытворчых аб'яднаньняў, зямельных таварыстваў і сельсаветаў за хутчэйшае і поўнае правядзеньне кантрактацыі азімых і яравых засеваў у гэтую пасеўную кампанію Белпаляводсаюз пастанавіў вылучыць спэцыяльны фонд у суме 15.000 рублёў.

За кошт вылучанага прэм'ювальнага фонду ўстанаўляецца 100 прэмій, куды ўваходзяць: трыераў—5, кіно-перасовак—5, жнівярак-самаскідак—10, радыёпрыёмнікаў—5, ільна-трапчотак — 10, сартовак—15, ільнатрапальных калёс—20, чыгунных трохвальцавых ільнамялак — 20 і дзесяць бібліятэк.

Пастаноўлена выдаваць прэміі тым калектыўным гаспадаркам, вытворчым аб'яднаньням, зямельным таварыствам і сельсаветам, якія цалкам закантрактавалі і засеялі ўсю вызначаную плянам пасеўную плошчу і лепш выканалі аграмінімум.

Пры акрпаляводсаюзах і раённых саюзах с.-г. каапэрацыі ствараюцца адборачныя прэм'ювальныя камісіі ў складзе прадстаўнікоў Паляводсаюзу, райсаюзу, а таксама ад зямельных і партыйных органаў.

Пры Белпаляводсаюзе складзена прэм'ювальнае бюро з прадстаўнікоў Белпаляводсаюзу, Белкалгасцэнтру, НКЗВ і ЦП саюзу сель. гасп. рабочых.

Канчатковы тэрмін падачы матар'ялаў у Белпаляводсаюз устаноўлены да 1-га ліпеня гэтага году з тым, каб да 15-га ліпеня прэміі былі разьмеркаваны.

Рад калгасаў Бабруйшчыны скончыў сяўбу

БАБРУЙСК. (ПА ТЭЛЕФОНУ АД НАШАГА КАРЭСПАНДЭНТА).

САЎГАСЫ БАБРУЙШЧЫНЫ З ПОСЬПЕХАМ РАЗГОРТВАЮЦЬ СЯЎБУ. САЎГАСЫ «БЯЛЕВІЧЫ», «СЬВІСЛАЧ», «ПАГОСТ», «КАПАТКЕВІЧЫ» і «ЛЯСКІ» ЎЖО СКОНЧЫЛІ СЯЎБУ. СЯЎБА ВА ЎСІХ САЎГАСАХ АКРУГІ БУДЗЕ СКОНЧАНА ДА 25 МАЯ.

У паход па сілас

БАБРУЙСК. (Па тэлефону ад нашага карэспандэнта). Акруговая экскурсія канфэрэнцыі калгасьнікаў у паходзе па сілас прайшла з вялікім посьпехам. Прадстаўнікі калгасаў, якія былі на канфэрэнцыі ў ліку 220 чал., прынялі пастанову аб максымальным разгортваньні сіласаваньня ў калгасах. Яны пастанавілі перад сабой задачу арганізаваць у кожным калгасе ня менш 1 сіласнай ямы. Тут-жа, на канфэрэнцыі, два буйнейшыя калгасы акругі «Луч Камуны» і «Расьсьвет» падпісалі сацыялістычны дагавор, паводле якога «Луч Камуны» абавязваецца засілаваць у гэтым годзе 36.000 пудоў, а калгас «Расьсьвет»—31.000

Канфэрэнцыя пастанавіла не пазьней 5 чэрвеня арганізаваць масавы агляд работы па сіласаваньні

Весткі не адпавядаюць сапраўднасьці

ЖЫТКАВІЧЫ. (Наш кар.). Некаторыя сельсаветы Жыткавіцкага раёну, ня гледзячы на рад прапаноў, не даюць ветак аб ходзе пасеўнай кампаніі. Калі гэтыя весткі і даюцца, то ў большасьці яны не адпавядаюць рэчаіснасьці. Такі падыход да работы не дае магчымасьці станавіць, як ідзе сяўба на мясцох.

Да апошняга часу паасобныя гаспадаркі ніяк ня могуць атрымаць насеньня кораньплодаў. Кепска стаіць справа з забесьпячэньнем цягавай сілай Бялеўскага калгасу. З прычыны недахвату коняй, яму вельмі цяжка самому справіцца з сяўбою.

Непарадкі перашкаджаюць сяўбе

У калгасе «Парыская Камуна», Лупадаўскага раёну, Магілеўскай акругі, зусім слаба разгорнута сяўба. Плянавых цэбі няма. Калгасьнікі кожны дзень збіраюцца, але ня ведаюць, што рабіць. За гэтага часу засеяна зусім мала плошчы. Сеюць непратручаным насеньнем простым не абмеценым на чыстагатунковае.

Прадукцыйнасьць працы ў калгасе нізкая. Працэсы спыліна ў заняпадзе. Часьць выпадкі нявыхаду калгасьнікаў на работу бяз грунтоўных прычын.

Батрацка-бядняцкай групы пры калгасе няма. У калгасе квітнее сямейнасьць, кумаўство.

Тамашэвіч Язэп.

АКРУГОВАЯ НАРАДА РАЙЗА АДЗНАЧЫЛА НЕДАХОПЫ У ПРАВЯДЗЕНЬНІ С.-Г. КАМПАНІІ

МАЗЫР. (Наш. кар.). Гэтымі днямі ў Мазыры адкрылася нарада прадстаўнікоў райзямаддзелаў сумесна з спэцыялістымі, на якой абгаворваліся пытаньні далейшага разьвіцьця сельскай гаспадаркі акругі. На нарадзе прысутнічала каля 150 чал.

Ня гледзячы на тое, што жывёлагадоўля набывае зараз асаблівa важнае значэньне, мясцовыя арганізацыі не зварачаюць на гэта пытаньне належнай увагі. Нарада прыняла рад мерапрыемстваў па паляпшэньні жывёлагадоўлі ў акрузе. Так, пастаноўлена пабудаваць 1.600 цялятнікаў, у якіх павінна быць вытадавана ў бліжэйшы час каля 65.000 шт. маладняка. Будзе таксама зьвернута большая ўвага на пашырэньне кантрактацыі, якая да апошняга часу знаходзілася па акрузе ў поўным занядбаньні. Нарада пастанавіла аддаць больш увагі сьвінагадоўлі. Па ўсёй акрузе намечана паставіць 6.500 малак і закантрактаваць 3.500 падсьвінакаў.

Нарада адзначыла рад памылак, дапушчаных у працы па зямляўпарадкаваньні. Сенажаць і пахаць паміж калгасамі яшчэ не разьмеркаваны. У справе вызначэньня яравога кліну індывідуальнаму сэктару быў дапушчан рад перагібаў, што ў паасобных выпадках закранула і беднякоў.

Нарада пастанавіла неадкладна прыступіць да складаньня рабочых плянаў уборачнай кампаніі. Даручана адпаведным арганізацыям скласьці сьпіс патрэбных с.-г. уборачных машын.

М. Вапельнік.

НЕАДКЛАДНА ЛІКВІДАВАЦЬ НЕНАРМАЛЬНАСЬЦІ

Арганізаваць збыт калгаснага малака

У калгасах Слуцкага раёну недапушчальна пастаўлена справа са збытам малака. Некаторыя калгасы ня ведаюць, дзе яго дзяваць, куды збываць.

Для прыкладу ўзяць хаця-б, калгас «Чырвоны Маяк». Там малако ад кароў 50-60 павінна быць пушчана на пераапрацоўку, бо для калгасьнікаў хапае малака ад рэшты кароў, што ёсьць у калгасе.

Між тым, праўленьне калгасу ня ведае, што рабіць з гэтым малакам. Старшыня некалькі раз наведваў райсаюз па гэтай справе і нічога канкрэтнага не дабіўся.

— Вазеце ў калгас «Прагрэс», там ёсьць пераапрацоўчы пункт—вось, што сказалі ў райсаюзе калгасу

І «Чырвоны Маяк» возіць кожны дзень малако ў «Прагрэс», а там..., там не спраўляюцца з пераапрацоўкай, малако кісьне, псуецца.

Калгасы ня ведаюць, на якіх умовах яны здаюць малако «Прагрэсу», вельмі абураны галавацяпствам. Райсаюз гэтым пытаньнем зусім не займаўся. Характарна, што ён у часе генэральнай праверкі падрыхтоўкі да сяўбы, якую праводзіла «Зьвязда», ня ведаў, колькі ў калгасах раёну малочнай жывёлы.

У калгасах няма скляпоў, дзе можна было-б трымаць малочныя прадукты. У калгасе «Вольная Праца» бочкі і цабры з малаком апускаюць у студню.

Мясцовым арганізацыям трэба гэтым пытаньнем заняцца.

ЗУРНОВІЧ.



Калгаснікі з калгасу «Чырвоны Штандар» за абедам у полі

ХЭМІЗАЦЫЯ БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ ГАСПАДАРКІ—

ВАЖНЕЙШАЯ ПРАБЛЕМА СЁНЕШНЯГА ДНЯ

(Да 2-га пленуму камітэту па хэмізацыі)

Рэканструкцыя народнае гаспадаркі савецкай дзяржавы, з абярненьнем яе з адсталай аграрнай краіны ў аграрна-індустрыяльную, патрабуе максымальнага скарыстаньня павейшых навуковых ідэй, перадавой тэхнічнай думкі.

Дагнаць і перагнаць у бліжэйшыя тэрміны эканамічнае разьвіцьцё высокаразьвітых капіталістычных дзяржаў Заходняе Эўропы і Амэрыкі мы зможам толькі тады, калі мы ўзьнімем нашу гаспадарку па вышэйшую тэхнічную базу.

Гэта акалічнасьць высоўвае хэмію ў рады вядучых галін народнае гаспадаркі, і хэмізацыя становіцца аднэй з асноўных палітычных і гаспадарчых задач сёнешняга дня.

Пяцігадовы плян разьвіцьця народнае гаспадаркі БССР, які складзен больш як паўгода таму назад, далёка не ў выстарчальнай меры ўлічыў ролю хэмізацыі народнае гаспадаркі. І таму прынятыя гэтым плянам, як быццам, вялізарныя тэмпы ўзросту хэмічнай прамысловасьці па сутнасьці аказаліся зусім невыстарчальнымі ўжо на другі год пяцігодкі. Хэмія па сваім значэньні для ўсёй народнай гаспадаркі не заняла таго месца, якое ёй належыць.

Сацыяльныя зрухі якія ўтварыліся ў сельскай гаспадарцы, патрабуюць асаблівай напружанасьці ў паскарэньні тэмпаў хэмізацыі краіны і ўзмацненьні хэмічнай вытворчасьці. Можна сказаць, што праблема ўздыму сацыялістычнай сельскай гаспадаркі, праблема ўздыму ўраджайнасьці ў значнай меры зьяўляюцца праблемамі савецкай хэміі. Калектывізацыя сельскай гаспадаркі плюс хэмізацыя — гэта зарука высокіх ураджаяў нашых савецкіх палёў.

Адсюль вывад—мы з рэвалюцыйнай рашучасьцю павінны перагледзець хэмічную пяцігодку. І тут мы павінны пайсьці ў тэмпах значна далей, чым выканаьне пяцігодкі за чатыры гады. Хэмічную пяцігодку трэба перакласьці ў корані, узяць установку на сапраўдную хэмізацыю гаспадаркі краіны.

Гэта перш-на-перш павінен улічыць другі пленум камітэту па хэмізацыі народнай гаспадаркі БССР, які сёньня склікаецца.

Нам зараз неабходна вырашыць праблему арганізацыі ў БССР вырабмінэральных угнаеньняў для сельскай гаспадаркі, максымальна скарыстаць фасфарытныя паклады, якія ёсьць, і ўзмацніць пераапрацоўку прыроднага багацьця нашай рэспублікі—торфу—для атрыманьня азотнага ўгнаеньня.

Разам з гэтым трэба ўжо перайсьці ад пастаноўкі пытаньня да рэальнага ажыцьцяўленьня скарыстаньня гідраэнэргетычных рэсурсаў Кабыляцкіх парогаў Дняпра для будаўніцтва электра-хэмічнай прамысловасьці, прыстасаваўшы яе ў першую чаргу для абслугоўваньня сельскай гаспадаркі.

Далей мы павінны паставіць перад хэмічнай прамысловасьцю задачу максымальнага ўдзелу ва ўздыме сельскае гаспадаркі, павышэньні яе ўраджайнасьці і таварнасьці шляхам арганізацыі вытворчасьці па пераапрацоўцы прадуктаў і адкідаў сельскай гаспадаркі.

Потым неабходна фарсаваць поўнае хэмічнае скарыстаньне нашых вялізарных лясных рэсурсаў, пачынаючы ад саматужнай лесахэмічнай прамысловасьці — смалакурэньня — да найбольш высока-арганізаванай—вырабу штучнага валакна.

Пленум камітэту па хэмізацыі, у які ўваходзяць прадстаўнікі пралетарскай і навуковай грамадзкасьці, павінен з найбольшай увагай аднесьціся да ўсіх гэтых пытаньняў. Падлічыўшы вынікі больш чым гадавой работы хэмічнага камітэту, намеціўшы бліжэйшыя задачы сваёй далейшай дзейнасьці, пленум павінен прарабіць адказьнейшую работу па разглядзе пяцігодкі хэмічнай прамысловасьці.

І, нарэшце, яшчэ адна задача стаіць перад пленумам—уцягнуць у працу камітэту найбольш выдатных рабочых ударнікаў і наблізіць работу камітэту да работы фабрык і заводаў.

К. БЭНЭК.

Неабходны тэрміновыя і рашучыя меры

Да ўборачнай кампаніі 400 сталовак і ачагоў у калгасах павінны быць арганізаваны

Плян арганізацыі грамадзкага харчаваньня ў калгасах да веснавой пасеўнай кампаніі з прычыны нядбайнасьці Белкаапсаюзу быў сарваны. Замест вызначаных плянам да адкрыцьця 200 палявых ачагоў і 200 сталовак, адкрыта ўсяго толькі... 35 сталовак і ачагоў.

Здавалася-б, што Белкаапсаюз, навучаны «практыкай» нядаўняга мінулага, павінен быў прыняць рашучыя меры, каб выканаць плян да ўборачнай кампаніі.

Між тым, Белкаапсаюз і зараз ніякай падрыхтоўчай працы па арганізацыі грамадзкага харчаваньня калгасьнікаў і саўгасьнікаў у часе ўборачнай кампаніі не вядзе.

Галоўнай перашкодай у справе выканаьня пляну арганізацыі сталовак зьяўляецца тое, што каапэрацыя не прыняла належных мер, каб забясьпечыць сваячасовую дастаўку абсталяваньня і падрыхтоўку патрэбных кадраў. Белкаапсаюз заказаў 1.000 тэрмасаў для сталовак, але па дагаворы, які заключан Белкаапсаюзам з заводам у Барысаве, большасьць гэтых тэрмасаў павінна паступіць толькі ў студзені 1931 году. Такім чынам, сталовыя, ачагі ў калгасах да ўборачнай кампаніі патрэбным інвэнтаром ня будуць забясьпечаны.

У радзе округ да гэтага часу яшчэ ня прыступлена да арганізацыі курсаў па падрыхтоўцы кадраў.

Неабходна прыняць тэрміновыя і рашучыя меры.

МАСАВАЯ ЭКСКУРСІЯ ДРУКАРОЎ У БАРЫСАЎ

БАРЫСАЎ. (Наш кар.). Група экскурсантаў рабочых менскіх друкарань у ліку 85 чалавек прыехала ў Барысаў для азнаямленьня з працаю рабочых Барысава.

На станцыі Барысаў менскіх экскурсантаў-рабочых сустрэлі са сьцягамі і музыкай рабочыя барысаўскіх прадпрыемстваў. У гарадзкім рабочым клюбе адбыўся ўрачысты вечар, на якім з прывітаньнем ад імя менскіх друкароў выступіў сакратар ЦП саюзу тав. ФЯДОТАЎ, які адзначыў вялікую ролю і значэньне сувязі рабочых друкароў Менску з рабочымі Барысава. Выступалі таксама іншыя рабочыя Менску, якія азнаёмілі барысаўскіх рабочых з сваёй працаю. Ад першай друкарні Менску выступіў тав. ГЕЛЬФАНД, які расказаў сходу аб тым, што да заключэньня сацспаборніцтва прамфінплян выконваўся на 80 проц., а пасьля падпісаньня сацыялістычнага дагавору за першы месяц плян быў выкананы на 103 проц.

Тав. ГОЛЬДБЭРГ (Менскі камбінат) зазначыў, што да ўступленьня ў сацспаборніцтва сабекошт 1.000 канвэртаў складаў 1 р. 25 к., а цапер—20 кап.

Ад імя рабочых барысаўскага камбінату вітаў менскіх рабочых т. МЭДЛІКАЎ, які ў кароткім слове рамказаў аб гэраічнай барацьбе рабочых Барысава за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады.

Рабочыя паслалі на імя Менскай VIII партканфэрэнцыі прывітальную тэлеграму, у якой запэўняюць камуністычную партыю, што яны аддадуць усе свае сілы на барацьбу за далейшыя посьпехі ў нашым сацыялістычным будаўніцтве. Рабочыя абяцаюць, што яны выканаюць пяцігадовы плян будаўніцтва ў чатыры гады.

Апэрацыйныя зводкі

З ГАСПАДАРЧАГА ФРОНТУ

Бясплянавасьць на заводзе „Энэргія"

Аб «увязцы» паміж цэхамі на заводзе «ЭНЭРГІЯ» сьведчаць наступныя факты. Кацёльным цэхам зроблены бункеры і сушыльныя барабаны на суму 110.000 рублёў. Але гэтыя машыны ня могуць быць скончаны таму, што плянавы аддзел «забыўся» даць распараджэньне мэханічнаму цэху зрабіць патрэбныя дэталі. А зараз, калі мэханічны цэх ужо атрымаў распараджэньне, ён ня можа пачаць рабіць дэталі з прычыны адсутнасьці бляшкаў - нарадаў, якія паказваюць характар работы і яе аплату

Ліцейны цэх працуе з недагрузкай. Вагавы цэх ня зможа ў тэрмін выканаць свае заданьні з прычыны адсутнасьці варштатаў, якія павінны быць дастаўлены арцельлю імя 1-га мая і Зьмілавіцкім райкамбінатам.

Выпуск сушыльных барабанаў затрымаецца з прычыны адсутнасьці сталёвага ліцьця, якое павінен быў даставіць фасфарытны трэст да 1-га мая і які, на запытаньне заводакіраўніцтва, параіў зьвярнуцца да Хэмбуду. А Хэмбуд на запытаньне заводакіраўніцтва зусім не адказвае.

Для выпуску бункераў патрэбны швэлеры № 12, якія павінны быць атрыманы ад гомельскага заводу «Пралетары». Але да гэтага часу швэлеры не атрыманы і калі будуць атрыманы—невядома.

На ўсе гэтыя няўвязкі адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал заводу «Энэргія» зварачае вельмі мала ўвагі і не адчувае пэрсанальнай адказнасьці за бесьперабойную работу заводу.

Брыгада «Зьвязды»: БРАЙНІН, ЗЭВІН, ПАЛІЧАНСКІ

Ударніцы менскай цукернай фабрыкі «Камунарка» т.т. СІНДЛЕР, ШАПІРА і ГІЛЬ

„Бальшавік" падводзіць „Чырвоную Бярэзіну"

Клей желятыннага цэху дрэнная якасьці

Клей, які атрымлівае «Чырвоная Бярэзіна» ад Менскай гарбарні «Бальшавік», зусім нізкай якасьці. Рабочыя «Чырвонай Бярэзіны» ўжо раз паслалі да рабочых «Бальшавіка» ліст, у якім прасілі палепшыць якасьць клею. Пасьля гэтага дзьве партыі клею былі некалькі лепшай якасьці. Але апошняя партыя ў 150 пудоў ЗУСІМ НІЗКАЙ ЯКАСЬЦІ. Клей ужываецца для замацаваньня сяркавай галоўкі запалак. Пры добрай якасьці клею запалкі высыхаюць на працягу 50 мін., а пры ўжываньні клею гарбарні «Бальшавік» запалкі сушацца 2-3 гадзіны. Гэты тормаз выклікае буйныя прастоі. Так, апошнія тры дні 400 работніц упаковачнага цэху сталі па 40-50 мінут.

Рабочыя «Чырвонай Бярэзіны» абураны такімі адносінамі рабочых желятыннага цэху гарбарні «Бальшавік» да сваіх абавязкаў.

Брыгадзір «Зьвязды» П. КАВАЛЁЎ.

Нечаканы прарыў

Першая дзесяцідзёўка мая па цьвікоўным заводзе «ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧНІК» (станцыя Барань, Аршанскай акругі) дала зусім нечаканы прарыў. Выкананьне праграмы па заводзе складае 80,3 ПРОЦ. Па асобных відах прадукцыі становішча зусім катастрафічнае. Праграма па вырабе машыновага тэксу недавыканана на 15 проц., па вырабе абойных цьвікоў—на 49,3%, па шавецкіх шпільках—на 14,4 проц. Варштаты стаяць цэлымі зьменамі з прычыны недахвату дробных рэчаў. Дробныя рамонты робяцца з вялікімі спазьненьнямі. Адпускная кампанія арганізавана вельмі дрэнна: у адпачынак пайшлі многія кваліфікаваныя рабочыя, а па варштатаў засталіся амаль выключна вучні і малакваліфікаваныя рабочыя. Гэта спрыяла надзвычайнаму росту браку. Напрыклад, па гранёным і круглым тэксе брак за 10 дзён складае 294 кілё ў той час, як за ўвесь красавік было 172 кілё браку. Белмэталятрэсту трэба зацікавіцца работай свайго заводу.

Брыгада АПБ: КАЙКОЎ, ВАСІЛЁНАК

„Работа" заводу „Пралетары"

У канцы лютага на КАРДОННУЮ ФАБРЫКУ ІМЯ ЛЕНІНА прывезьлі новы кохар — работы гомельскага машына-будаўнічага заводу «ПРАЛЕТАРЫ». Новы кохар працаваў нядоўга. Праз некаторы час кохар так запарыў яліну, што яе прышлося выкінуць. І калі разабралі кохар, дык на краёх яго ўбачылі шчыліны, што сьведчыла аб нядобраякаснай рабоце заводу «Пралетары». Такім чынам, машына коштам у 10.000 рублёў, вышла са строю.

Хто адкажа за такую кепскую работу?

Рабочы кардоннай фабрыкі Ш.

Мазырскі камунтрэст працуе кепска

Прадпрыемствы Мазырскага камунальнага трэсту за першае паўгодзьдзе ня выканалі сваіх прамфінплянаў. Недавыкананьне праграмы па цукеркавай фабрыцы «Чырвоны Мазыранін» складае 3,6 проц., па фабрыцы «Прафінтэрн» — 8,9 проц., па крухмальні — 38,1 проц., па цагельні — 14,5 проц.. Тое самае ў галіне зьніжэньня сабекошту. На некаторых прадпрыемствах камунтрэсту, як напрыклад, на вадаправоднай станцыі, Гарочыцкім лесазаводзе і іншых, сабекошт нават ПАВЯЛІЧАНЫ НА 2—11 ПРОЦ.

Чым-жа тлумачацца гэтыя прарывы? Справа ў тым, што складаньне прамфінпляну праводзілася Ў ГАБІНЭТАХ. Рабочая маса аб прамфінпляне зусім мала інфармавана. Вакол выкананьня прамфінпляну ня была мабілізавана грамадзкая думка. Сацдагавары заключаліся, але выкананьне іх не правярялася. Уздым энэргіі і рабочай масы які выявіўся ў арганізацыі ўдарных брыгад, ня быў падхоплены заводзкім арганізацыямі. Вось асноўныя прычыны недавыкананьня прамфінплянаў прадпрыемствамі Мазырскага камунтрэсту.

М. В.

Праверыць давядзеньне прамфінпляну да варштату

На нарадзе пры ЦКК-РСІ

Учора пры ЦКК-НК РСІ адбылася інструкцыйная нарада старшынь груп «лёгкай кавалерыі», старшынь вытворчых нарад і кансультантаў, прымацаваных да прадпрыемстваў, па пытаньні правядзеньня налёту на Менскія прадпрыемствы з мэтаю праверкі давядзеньня прамфінпляну да варштату.

На нарадзе прысутнічала 35 асоб. З ліку старшынь вытворчых нарад былі толькі 4 чалавекі (завод «Бальшавік», «Дрэвааапрацоўшчык», фабрыка «Акцябр» і абутковая фабрыка).

Інструкцыйны даклад ад імя штабу кіраўніцтва налёту зрабіў тав. ЖУК.

На адбыўшымся пасьля нарады паседжаньні штабу пастаноўлена ад 23 да 26 мая для кансультацыі ўдзельнікаў налёту ўстанавіць дзяжурствы ад штабу ў памяшканьні ЦКК РСІ: у дзень ад 9 да 4-х гадзін, пакой № 11 (тэл. 7-57), вечарам—ад 6 да 8 гадзін, пакой № 9 (тэл. 8-88).

Вынікі па налёце запрапанавана здаваць у ЦКК дзяжурнаму па штабе.

В.

Зноў трывожныя лічбы

Вынікі работы рэспубліканскай прамысловасьці

Супроць ўсялякіх меркаваньняў, кравік месяц зноў прынёс трывожныя вынікі. Ня гледзячы на тое, што калянарны плян выканан з некаторым перавышэньнем, вынікі работы прамысловасьці за красавік, прымаючы пад увагу барыў за першае паўгодзьдзе, а таксама і тую акалічнасьць, што красавік мінулага году адзначыў прырост прадукцыі на 14 проц., належыць прызнаць усім недастатковымі.

Валавая прадукцыя, якая склала па цэнах 26-27 г. 25.783 т. р., у параўнаньні з мінулым м-цам дала павялічэньне толькі на 2,9 проц., а ў параўнаньні з апаведным м-цам 26-29 г. на 63,8 проц. Такім чынам, у параўнаньні з сакавіком мес., які адзначыў месячны прырост прадукцыі на 14,8 проц., а гадавы на 2,5 проц., маем значнае паслабленьне тэмпаў разгортваньня прамысловасьці. Гэта сьведчыць аб тым, што выяўленая сакавіку мес. тэндэнцыя да паляпшэньня паказальнікаў, не атрымала дальнейшага разьвіцьця.

Асноўнымі галінамі, якія аказалі заспрыяльваючы ўплыў па разьвіцьцё прамысловасьці ў красавіку мес., трэба адзначыць: мэталёвую, якая супроць мінулага мес. дала заняпад вытворчасьці на 5,4 проц., вытворчасьць будаўнічых матар'ялаў (скарачэньне вытворчасьці на 26,7 проц.), дрэвааапрацоўчую (4,8 проц.), тэкстыльную (6 проц.) і паліграфічную (3 проц.).

Нельга пахваліцца вынікамі работы гарбарна-абутковай і запалкавай прамысловасьці, якія, ва ўмовах узрастаючай праграмы, паказваюць параўнальна недастатковы тэмп разгортваньня вытворчасьці—адпаведна +6,5 проц. і раней зусім недастатковымі зьяўляюцца вынікі работы акулярнай ф-кі галянтарэйнай, якія яшчэ значна адстаюць ад заданьняў, намечаных прамфінплянам.

У сувязі са значным аслабленьнем тэмпу разгортваньня прамысловасьці за красавік, валавая прадукцыя за 7 месяцаў, якая складае па цэнах 26-27 г. 155.329 т. р., у параўнаньні з апаведным пэрыядам мінулага году паказвае прырост на 70,4 проц. замест 72,1 проц. за першае паўгодзьдзе. Праўда, з прычыны таго, што першапачатковымі намячэньнямі прамфінпляну прадугледжан недастатковы прырост прадукцыі за красавік, каэфіцыент выканаьня прамфінпляну за 7 м-цаў некалькі павышаецца (з 94,2 проц. да 95,2 проц.). Аднак, трэба яшчэ раз падкрэсьліць, што гэта лічба ні ў якім разе ня можа нас задаволіць, бо гадавы плян за 7 месяцаў выкананы усяго на 51,8 проц. Паранейшаму мы маем па вельмі значным коле галін прамысловасьці прыметнае невыкананьне прамфінпляну, што пацьвярджаецца наступнымі лічбамі. Па мэталёвай прамысловасьці плян за 7 м-цаў выкананы на 92,1 проц., вытворчасьці хэмічнай крэйды—94,1 проц., керамічнай—88,8 проц., шкляной—90,4 проц., дрэвааапрацоўчай—95,8 проц., вытворчасьці акуляраў—87 проц., апрацоўцы шчаціны—85 проц., тэкстыльнай—83,2 проц., галоўным чынам, за кошт нездавальняючай работы па баваўнянай і суконнай, па гарбарна-абутковай — 85,2 проц., пры выкананьні пляну па абутковай толькі на 79,5 проц., паліграфічнай—95,8 проц., запалкавай — 97,9 проц., харчовай—90,1 проц., галоўным чынам, за кошт цукернай прамысловасьці і галянтарэйнай—73,7 проц.

Ня зусім спрыяючыя паказальнікі з пункту погляду вытворчасьці мы маем тым, што да гэтага часу пытаньне аб ўстанаўленьні правільнага рэжыму працы на прадпрыемствах яшчэ не ўпаравдавана. Гэта ў значнай меры тлумачыцца тым, што і ў красавіку мес. дырэктыва аб адзінаначальні яшчэ не атрымала свайго канкрэтнага праламленьня на практыцы. Павялічэньне прагулаў зьяўляецца паказальнікам недастатковай арганізацыі і выхаваньня рабочых мас з боку нізавых прафэсыянальных і партыйных арганізацый.

Адмоўным момантам трэба таксама лічыць і ўсё яшчэ цякучасьць рабсілы. Гэта пытаньне павінна прыцягнуць да сябе асаблівую ўвагу. Неабходна ў тэрміновым парадку паставіць работу па вывучэньні прычын цякучасьці з тым, каб неадкладна намеціць канкрэтныя мерапрыемствы, якія-б зьнішчылі гэты недахоп.

У выніку неадпаведнага тэмпу разгортваньня вытворчасьці, павялічэньня рабочае сілы, узросту прагулаў і цякучасьці, якія выклікаюць некаторае зьмяненьне складу рабочае сілы, а таксама недастатковага зжыцьця тых арганізацыйна-тэхнічных недахопаў, якія мелі месца на працягу першага паўгодзьдзя, красавік м-ц паказвае ўпад выпрацоўкі на 1 чалавека-дзень на 0,5 проц. і на адну чал.-гадзіну на 2,2 проц.

Канчатковыя вынікі зьніжэньня сабекошту за першае паўгодзьдзе ўсё-ж яшчэ сыгналізуюць трывожнае становішча з выкананьнем аднэй з важнейшых дырэктыў бягучага году. Замест 11,5 проц. (на тым-жа коле прадпрыемстваў) за першае паўгодзьдзе зьніжэньне сабекошту складае 7,8 (без дрэвааапрацоўч.), прычым трэба адзначыць, што сакавік м-ц у параўнаньні з сярэднягадавым дадуў параўнальна высокі каэфіцыент зьніжэньня сабекошту (11,1). Аднак, прымаючы пад увагу пагоршаньне асноўных паказальнікаў работы прамысловасьці ў красавіку, трэба чакаць, што за 7 м-цаў мы будзем мець некаторае паменшаньне каэфіцыенту зьніжэньня сабекошту.

Па галоўнейшых галін прамысловасьці зьніжэньне сабекошту за першае паўгодзьдзе ў параўнаньні з плянавым заданьнем прадстаўляецца ў наступным выглядзе:

Галіны прам.	Зьніж. сабек. у проц. паводле плану	Зьніж. сабек. у проц. за порш паўг.
Шкляная	10,7	7,2
Мэталёвая	16,0	10,9
Шэйная	10,1	9,2
Запалкавая	12,0	2,4
Папяровая	12,2	6,9
Пап. трыкатажн.	8,3	10,3
Баваўняная	13,7	3,9
Суконная	17,5	2,4
Гарбарн.-абутков.	12,0	4,5
Харчовая	9,5	8,1
Махорачная	6,2	1,4
Ільнапрадзільная	13,5	9,9

Як відаць з апошніх матар'ялаў, ёсьць прарывы і ў адносінах мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў, якія выкліканы выключна невыкананьнем норм няскончанай вытворчасьці. Павялічэньне астаткаў няскончанай вытворчасьці сьведчыць аб паяўнасьці ў прамысловасьці цэлага раду арганізацыйна-тэхнічных недахопаў.

Для выкананьня прамфінпляну па працягу апошніх 5-ці м-цаў павінны быць прыняты рашучыя і гэраічныя меры з тым, каб ліквідаваць тыя недахопы, якія мелі месца на працягу ўсяго мінулага пэрыяду. Гэта са ўсёй рашучасьцю яшчэ раз ставіць перад усім адміністрацыйна-тэхнічным пэрсаналам і апаратам прамысловасьці, усёй рабочай грамадзкасьцю і ўсімі нізавымі прафэсыянальна-партыйнымі арганізацыямі рад адказнейшых задач.

Невыкананьне прамфінпляну за 7 мес. зьяўляецца вынікам недастатковага давядзеньня ў жыцьцё ў свой час даных дырэктыў і загадаў ВСНГ. Такое становішча ўтварае простую пагрозу выкананьню прамфінпляну. Неадкладная задачай зьяўляецца давядзеньне ў жыцьцё наступных мерапрыемстваў.

Неабходна там, дзе яшчэ гэта ня зроблена, тэрмінова перагледзець прамфінплян на час, што застаўся, з тым, каб безагаворачна перакрыць той прарыў, які ўтварыўся на працягу мінулых месяцаў. Гэтыя новыя заданьні неабходна неадкладна разьмеркаваць на кожным прадпрыемстве і давесьці да кожнага цэху, варштату і рабочага. Трэба раз на заўсёды скончыць з тым безначальлем, якое яшчэ наглядаецца на радзе прадпрыемстваў. Дырэктывы аб узмацненьні кіраўніцтва прадпрыемствамі і тэх. кіраўніцтва павінны атрымаць свой адбітак на практыцы. Праверка гаспадарча-палітычных дагавораў паказала рад недахопаў, якія ёсьць ў справе кіраўніцтва і садзейнасьці сацспаборніцтва. Гэтым недахопам павінен быць наложан канец, бо трэба памятаць, што сацспаборніцтва зьяўляецца рашаючым фактарам у справе выкананьня прамфінпляну.

Неабходна раз назаўсёды палажыць канец таму становішчу, якое маецца ў прамысловасьці ў сувязі з яшчэ слабай дысцыплінай працы. Тыя дасягненьні, якія маюцца ў адносінах скарыстаньня рабочага часу, у параўнаньні з мінулым годам неабходна ня толькі замацаваць, але і ў далейшым іх разьвіваць з тым, каб прагулы давесьці да нуля.

Трэба зьвярнуць увагу на роўнамернае распаўсюджаньне водпускаў, у мэтах аслабленьня сэзоннага ўпаду вытворчасьці ў летнія месяцы. Ня менш важнай задачай зьяўляецца таксама прыняцьце адпаведных мер барацьбы з цякучасьцю рабочай сілы.

Ударнішымі задачамі застаюцца пытаньні максымальнага разгортваньня капітальнага будаўніцтва, якое яшчэ недастаткова разьвіваецца.

Неабходна фарсаваным тэмпам разгарнуць вывазку і сплаў лесамат. і дроў.

Асаблівую ўвагу павінны прыцягнуць да сябе і пытаньні, зьвязаныя з забесьпячэньнем выкананьня памячэньняў у адносінах рэальнай зарплаты і агульнага паляпшэньня культурна-бытавога становішча работы. У прыватнасьці, неабходна зьвярнуць увагу на ўзмацненьне такіх вучасткаў работы, як аховa працы і тэхнікі бясьпечнасьці.

Вось тыя галоўнейшыя мерапрыемствы, якія павінны быць праведзены ў жыцьцё. Час не чакае, неабходна дабіцца рашучага пералому ў рабоце прамысловасьці з тым, каб прамфінплян па лініі ўсіх паказальнікаў быў бясспрэчна выкананы.

А. ШУЛЬМАН.

Перанос тыражоў пазык

З 20 мая па 14 чэрвеня ў Маскве будзе праведзена 6 тыражоў 1 і 2 пазык індустрыялізацыі і тыраж пазыкі ўмацаваньня народнае гаспадаркі, перанесеныя з больш позьніх тэрмінаў

Пастанова Народнага Камісарыяту Фінансаў Саюзу ССР

ад 17 мая 1930 году

У сувязі з абменам аблігацый 1-й і 2-й пазык індустрыялізацыі і пазыкі ўмацаваньня сельскай гаспадаркі на аблігацыі пазыкі «Пяцігодка—за чатыры гады» ў мэтах забесьпячэньня трымальнікам пазык, якія абменьваюцца, магчымасьці прымаць удзел да абмену ва ўсіх тыражох, падлягаючых правядзеньню да 1 студзеня 1931 г. і ў мэтах спрашчэньня разьлікаў пры абмене НКФ СССР **пастанаўляе:**

1) Перанесьці 12-ты тыраж выйгрышаў 1-й пазыкі індустрыялізацыі народнай гаспадаркі СССР з 20-22 жніўня на 2 і 3 чэрвеня 1930 г., з выплатай выйгрышаў па аблігацыях, што выйгралі ў гэтым тыражы, пачынаючы з 20 жніўня 1930 году.

13-ты тыраж выйгрышаў 1-й пазыкі індустрыялізацыі народнай гаспадаркі СССР—з 20-22 лістапада на 4 і 5 чэрвеня 1930 г., з выплатай выйгрышаў, пачынаючы з 20 лістапада 1930 году.

7-мы тыраж выйгрышаў 2-й пазыкі індустрыялізацыі—з 20-22 чэрвеня на 6-8 чэрвеня 1930 г. з выплатай выйгрышаў з 20 чэрвеня 1930 году.

8-мы тыраж выйгрышаў 2-й пазыкі індустрыялізацыі—з 20-22 лістапада на 9-11 чэрвеня 1930 г. з выплатай выйгрышаў, пачынаючы з 20 лістапада 1930 году.

9-ты тыраж выйгрышаў 2-й пазыкі індустрыялізацыі—з 20-22 сьнежня на 12-14 чэрвеня 1930 году з выплатай выйгрышаў, пачынаючы з 20 сьнежня 1930 году.

6-ты тыраж дзярж. унутр. выйгрышнай пазыкі ўмацаваньня сельскай гаспадаркі — з кастрычніка на май 1930 году, назначыўшы пачатак тыражу на 20 мая, з выплатай выйгрышаў, пачынаючы з 1 кастрычніка 1930 году.

Усе пералічаныя тыражы правесьці ў Маскве.

2) Тыражы выйгрышаў 3-й пазыкі індустрыялізацыі правесьці ва ўстаноўлены тэрміны.

Народны камісар фінансаў Саюзу ССР БРУХАНАЎ.

Зам. начальніка кіраўніцтва дзяржкрэдыту НКФ СССР ЛОЯВЕЦКІ.

***

У сувязі з апублікаванай вышэй пастановай Наркамфіну СССР аб пераносе тыражоў 1-й і 2-й пазык індустрыялізацыі і пазыкі ўмацаваньня сельскай гаспадаркі на май-чэрвень, тав. **Брухнаў** паведаміў нашаму супрацоўніку наступнае:

— Зараз Наркамфінам вядзецца энэргічная работа па падрыхтоўцы выпуску ў ліпені новай пазыкі — «Пяцігодка за чатыры гады». Абмен масавых пазык на новую пазыку пачнецца адначасова з разьмяшчэньнем новай пазыкі — у ліпені.

Для таго, каб забясьпечыць нармальны ход абмену, Наркамфін СССР пастанавіў перанесьці тыражы па пазыках, якія абменьваюцца, на больш раньнія тэрміны. Справа ў тым, што на пэяд разьмяшчэньня і абмену прыпадаюць тыражы 1-й і 2-й пазык індустрыялізацыі і пазыкі ўмацаваньня сельскай гаспадаркі. Гэтыя пазыкі пабудаваны на некалькі іншых умовах, чым новая пазыка, і таму трымальнікі іх у выніку абмену маглі пазбавіцца магчымасьці прымаць удзел у тыражох, якія прыходзяцца на пэрыяд да 1-га студзеня 1931 г. Вось чаму ўсе гэтыя тыражы пераносяцца Наркамфінам па май і чэрвень. **Выплата выйгрышаў па гэтых тыражох будзе праводзіцца ва ўстаноўленыя раней тэрміны.** Такім чынам, трымальнікі 1-й і 2-й пазык індустрыялізацыі і пазыкі ўмацаваньня сельскай гаспадаркі сьпярша прымуць удзел у тыражох і атрымаюць належныя ім прыбыткі, а потым—бяз ушчэрбу для сябе—абмяняюць свае аблігацыі на новую пазыку.

Гаспадарчыя арганізацыі нерацыяналь на скарыстоўваюць транспарт

Моцна ўдарыць па тых, хто наносіць шкоду дзяржаве

Тэмп разьвіцьця сацыялістычнага будаўніцтва краю на выкананьні пяцігодавага пляну ў чатыры гады патрабуе асаблівай выразнасьці і ўменьня скарыстаць усе наяўныя сродкі народнай гаспадаркі больш актыўна і рацыянальна.

Між тым, на справе мы часта бачым адваротнае зьявішча. Падамо некалькі характэрных прыкладаў скарыстаньня транспартных сродкаў кліентураю, г. зн. гаспадарчымі органамі.

У сувязі з [illegible] задачамі, якія будуць пастаўлены перад транспартам у асеньнія месяцы бягучага году, цэнтральны камітэт па перавозках па сваім пленуме пастанавіў: абавязаць усе гаспадарчыя органы і каапэрацыю максымальна выкарыстаць сродкі транспарту ў летнія месяцы май—жнівень (як менш загружаныя), у асаблівасьці на перавозцы будаўнічых, лясных матар'ялаў і дроў. І што-ж мы бачым? Менская кантора Саюзлесу, маючы да перавозкі ня менш 1.000 вагонаў лесаматар'ялаў, якія знаходзяцца ля прыстаняй Днепра-Пятроўскага параходзтва, пасьля неаднаразовай прапановы Заходняга раённага камітэту па перавозках, не перастае упарта сабатаваць гэта заданьне.

Па гэтым пытаньні камітэт па перавозках зварачаўся да пракураду БССР, УССР, РСІ БССР, нам. упаўн. Наркамату Шляхоў Зносін пры СНК БССР, Саюзлесу СССР і інш. органаў, але воз і да цяперашніх дзён ня зрушаны з месца. А Менская кантора Саюзлесу матывуе гэта «аб'ектыўнымі і незалежнымі ад яе прычынамі».

Спэцыяльна арганізаваная ўдарная брыгада па ўзмоцненым завозе грузаў у летнія месяцы і рацыянальным скарыстаньні сродкаў транспарту пытаецца: дзе-ж знайсьці тых службовых асоб, якія, стоячы на варце выкананьня пяцігадовага пляну ў чатыры гады, не на словах, а на справа разьвязалі-б гэты «гордыяў вузел» і прыцягнулі-б да адказнасьці тых, што прынесьлі шкоду дзяржаве, бо рачны танаж Днепра-Пятроўскага дзярж. параходзтва прастойвае нескарыстаным.

Другі выпадак. На пленуме заходняга раённага камітэту па перавозках прадстаўнікі лясных арганізацый заявілі, што яны, моў, ня могуць павялічыць зараз перавозкі грузу [illegible] проц. лясных матар'ялаў і 34 проц. дроў знаходзяцца нявывезенымі з лесу. А інспэктарскі апарат зах. раённага камітэту па перавозках паведамляе, што толькі ў раёне станцый Асташкава-Соблага і Соблага-Сяліжарава ёсьць да 10.000 вагонаў надвезенага лесу і дроў, але заявак на гэтыя грузы чамусьці не паступае.

Трэці выпадак. На станцыі Віцебск ад 19-II да 1-V г. г. усяго было разгружана 1.000 вагонаў каменьняў, з якіх звыш 800 вагонаў яшчэ ня вывезены. Між тым, 380 вагонаў каменьняў, якія належаць Віцебскаму Дараддзелу, праўсё яшчэ застаюцца на Чэпінскай ветцы ў той момант, калі гэты нявываз зрывае пагрузку экспартнага лесу, таму ўдарная брыгада, акрамя прапаноў Віцебскаму дараддзелу (ачысьціць вучастак да 31-V г. г.), просіць РСІ БССР, як у другім, так і ў трэцім выпадках, расьсьледзаць справу і прыцягнуць вінаватых да адказнасьці.

Адначасова з гэтым, ударная брыгада зварачаецца да ўсіх партыйных і грамадзкіх арганізацый і ўсіх пралетараў БССР з просьбаю разгарнуць работу ў летні час на сваячасовым завозе грузаў на месцы.

Кіраўнік ударнай брыгады ад ЦКП—ЦАРКОЎ.

РЫХТУЕМСЯ ДА УСЕБЕЛАРУСКАЙ ВЫСТАЎКІ

Будаўніцтва выстаўкі скончыць у тэрмін

Тэрмін скончэньня пабудовы павільёнаў выстаўкі, вызначаны пастановай СНК, Белдзяржбудам ня выкапан. Ужо прайшло 15-га мая, а канца работы ня відаць. Маса павільёнаў знаходзіцца яшчэ ў зусім сырым, чорным выглядзе. Тыя павільёны, якіх пабудова канчаецца, патрабуюць апрацоўкі, як са знадворнага боку, так і ў сярэдзіне.

Некаторыя скончаныя павільёны, як, напрыклад, масавых экспанатаў, патрабуюць выпраўленьняў, бо ў часе дажджу сьцены і дах працякаюць. Іншыя павільёны, якія можна было-б прызнаць скончанымі і распачаць у іх расстаноўку экспанатаў, выкарыстоўваюцца Белдзяржбудам, як майстэрні. У такім стане знаходзіцца павільён мясцовай і саматужнай прамысловасьці.

Павільён рэспубліканскай прамысловасьці папсаваны тым, што сьцены яго забруджаны дёгцем, які ўжываўся замест смалы. Цяпер хоць зьдзірай абшыўку сьцен.

Увогуле, марудна́сьць Белдзяржбуду прывяла да зрыву сваячасовага прыняцьця ў павільёны экспанатаў. Сэктару прамысловасьці выстаўкі, у сувязі з затрыманьнем пабудовы павільёнаў, асабліва рэспубліканскай прамысловасьці, прышлося даць заводам і фабрыкам, экспануючым сваю прадукцыю на выстаўку, паказаньне аб часовым затрыманьні пасылкі экспанатаў на выстаўку.

Ужо пісалася аб тым, што няскончаныя будаўнічыя работы не дадуць магчымасьці разгарнуць работу па дэкараваньні выставачнай тэрыторыі. А работа гэта не маленькая і павінна была ўжо распачацца. Да дэкараваньня тэрыторыі трэба яшчэ расплянаваць тэрыторыю выстаўкі для адводу дажджавой вады і наладзіць дарогі, што таксама тармозіцца з прычыны нескончэньня будаўніцтва.

Необходна прылажыць усе намаганьні, каб будаўнічыя работы на выстаўцы былі закончаны хаця-б да 1-га чэрвеня.

Патрэбны асаблівыя меры, каб зрабіць пералом у тэмпах будаўніцтва выстаўкі — інакш сваячасовасьць адчыненьня яе стане пад сур'ёзную пагрозу.

К—н.

Як „Белрыба" забясьпечвае патрэбы рабочых спажыўцоў

Шмат пісалася ўжо ў газэтах пра галавацяпства работнікаў «Белрыбы». Але ніхто дагэтуль ня спыняўся на тым факце — якімі рыбнымі прадуктамі «Белрыба» забясьпечвае рабочых спажыўцоў.

А факты гаворацьь аб тым, што «Белрыба» пасылае ў Менск для рабочай каапэрацыі рыбу дрэннай якасьці, нават ня рыбу, а нейкую дробную рыбку вагою ў 5-10 грам, што спажывец адмаўляецца браць.

За гэту дробную і нікуды нягодную рыбу «Белрыба» ўстанавіла плату 25 кап. за кілё, прычым ЦРК, паводле пастановы Наркамгандлю, робіць накідку ў 10 кап. і бярэ 35 кап. за кілё. Але ЦРК прыходзіцца гэты прадукт прадаваць з вялікай стратай для сябе на 15 кап. кілё, і пры гэтай цане ніхто ня хоча купляць такога тавару.

Мы лічым, што вылаўліваньне гэткай рыбы зьяўляецца злачынствам, бо яна магла даць прырост і быць больш карыснай для спажываньня.

Мала таго, «Белрыба» не зварачае ўвагі на якасьць рыбы, якую яна дасылае рабочай каапэрацыі, і рыбныя прадукты часта прыходзяць у Менск зусім папсаванымі (на гэта за апошнія часы ўжо было складзена некалькі актаў згодна аналізаў, зробленых санітарна-гігіенічным інстытутам). Такой дробнай, нікуды нягоднай рыбы за апошнія часы прыбывае на 500-600 кілёгр. кожны дзень. Зусім папсаванай рыбы за апошнія дні было атрымана 140 кілёгр. і 76 кілёгр.

На ўсе гэтыя ненармальныя злачынныя выпадкі Цэрабкоп зварачаў увагу «Белрыбы», але гэтыя заявы і скаргі праходзяць міма вушэй апарату «Белрыбы».

Наогул з апаратам «Белрыбы» ня зусім добра. «Белрыба» трымае вялікі апарат, бярэ сабе за арганізацыйную работу па рыбнай справе 30 проц., але сапраўднай работы ня відаць.

Многія работнікі «Белрыбы» — інструктары і загадчыкі гаспадарак — зусім слаба знаёмы з рыбнай гаспадаркай.

РСІ трэба было-б зацікавіцца работай апарату «Белрыбы» і выкінуць адтуль тых людзей, якія толькі займаюць пасады і аб сапраўднай работе не клапоцяцца.

СВОЙ.

МЕНСК

Паляпшэньне бытавых умоў працоўных жанчын

Нядаўна бытавая сэкцыя Менгарсавету заслухала даклад МЦРК і Белжылсаюзу аб паляпшэньні бытавых умоў працоўных жанчын.

Сэкцыя адзначыла, што БЖС і МЦРК дасягілі ў гэтым напрамку значных посьпехаў. Адкрыты новыя сталоўкі, ясьлі, дзіцячыя пляцоўкі і інш., але рост культурна-бытавых устаноў ішоў стыхійна, не было пляпавасьці ў гэтай рабоце. Бытавыя камісіі БЖС слаба папулярызавалі ролю і значэньне гэтых устаноў у працы жанчын.

Жакты № 3 і 16, пераадэнваючы свае сілы, рабілі прапановы аб ліквідацыі ўсіх сталовых МЦРК і клюбаў прафсаюзаў і замест іх патрабавалі сканцэнтраваньня ўсіх бытавых устаноў пры Жактах.

Работа бытавых камісій ня ўвязана з работаю ахматмладу і інспэкцыі Нарасьветы. Дзейнасьць культ-бытавых устаноў вельмі слаба да гэтага часу асьвятлялася ў нашым друку.

Бытавая сэкцыя гарсавету прыняла рад канкрэтных пастаноў аб паляпшэньні працы МЦРК і БЖС у справе абслугоўваньня працоўных жанчын.

25-гадовы юбілей Янкі Купалы

У зьвязку з надыходзячым 25-гадовым юбілеем літаратурнай дзейнасьці народнага паэты Рэспублікі Янкі Купалы Наркамасьветы арганізуе 25-26 мая вечар, прысьвечаны літаратурнай дзейнасьці паэты.

ПЕРШЫ ГУКАВЫ ФІЛЬМ

21-га мая ў памяшканьні Музтэхнікуму адбудзецца генэральная проба канцэртнай праграмы, якая будзе запісана на першы гукавы кіно-фільм Белдзяржкіно. Першы фільм будзе выпушчаны ў працяту бліжэйшага месяца.

ПОЛЬСКІ ВАНДРОЎНЫ ТЭАТР

У Менск вярнуўся з падарожжа па Койданаўскім раёне польскі вандроўны тэатр. Тэатр даў 18 пастановак, з іх 6 канцэртаў. 1-га мая вандроўны тэатр наладзіў у вёсцы вялікі антырэлігійны карнавал.

КУРСЫ ДЛЯ ПАДРЫХТОЎКІ АНТЫРЭЛІГІЙНЫХ РАБОТНІКАЎ

Паміж 1-ым і 15-м чэрвеня ў Менску адкрываюцца ўсебеларускія курсы для падрыхтоўкі антырэлігійных работнікаў на 100 чалавек. Тэрмін навучаньня па курсах — паўтара месяцы.

КУЛЬТУРНАЕ АБСЛУГОЎВАНЬНЕ ЭКСКУРСАНТАЎ

Пры Галоўвыстаўкоме ствараецца штаб па культурным абслугоўваньні экскурсантаў першай усебеларускай с.-г. і прамысловай выстаўкі. Старшыня штабу — акруговы інспэктар Нарасьветы тав. **Ярмакоў.** У склад штабу ўвойдуць прадстаўнікі Наркамасьветы, ЦСПСБ, Белдзяржвыдавецтва, Белдзяржкіно і інш. арганізацый.

ЛЕТНІЯ КАНІКУЛЫ

Устанаўляюцца летнія канікулы для вучняў першага курсу вячэрніх рабочых школ навышнанага тыпу — ад 1-га чэрвеня, а для 2-га і 3-га курсаў—ад 15-га чэрвеня.

Радыё-перадача

СЕРАДА, 21-га мая.

18-00 — Пасьляабедзены канцэрт.
18-30 — Час Дому Санасьветы: што трэба ведаць аб сыфілісе — **д-р Шапіро.**
19-00 — Беларуская радыё-газэта.
20-00 — Праверка часу.
20-00 — Беларуская работніца і сялянка на радыё.
21-00 — Газэта на польскай мове.
21-30 — Гутарка: мэліярацыя і культура балот на Ўсебеларускай сельскагаспадарч. і прам. выстаўцы — т. **Шыперка.**
22-00 — Канцэрт.

ЧАЦЬВЕР, 22-га мая.

18-00 — Пасьляабедзены канцэрт.
18-30 — Перадача для піонэраў і вучняў.
19-00 — Беларуская радыё-газэта.
20-00 — Праверка часу.
20-00 — Час калектывістага.
20-30 — Час грамадзкіх арганізацый.
21-00 — Час прафработніка: аб працы сярод сэзоньнікаў — т. **Кавалёў.**
21-30 — Азбука — марэ.
22-00 — Канцэрт.

За разбазарваньне аблігацый—да грамадзкай адказнасьці

Доўга клапацілася камісія садзейнасьці дзяржкрэдыту пры НКФ па правядзеньні сярод свайго калектыву растлумачальнай работы аб парадку продажу і закладкі аблігацый III-й пазыкі. Камісія ўвесь час упэўняла свой калектыў, што прадаваць аблігацыі не забаронена, каб яны вельмі не клапаціліся — «як толькі вам будуць патрэбны грошы, вы атрымаеце дазвол на продаж».

І вось за час з 1 сакавіка па 17 красавіка, г. зн. на працяту паўтара месяцаў, калектыў НКФ пачаў бамбадаваць сваю камісію заявамі ад выдачы дазволу на продаж аблігацый—«няхай камісія прапрацуе, няхай ажыцьцяўляе тое, што яна нам абяцала». Камісія пачала склікаць адно пасяджэньне за другім, усяго за паўтара месяцы камісія засядала 7 раз (калі-б так часта зьбіралася эканомкамісія, дык справа ў НКФ значна палепшылася-б).

Перад намі зараз рашэньні камісіі садзейнасьці дзяржкрэдыту пры НКФ, якія нельга інакш назваць, як разбазарваньнем аблігацый 3-й пазыкі. Вось прыклады. Камісія выдае дазвол на продаж аблігацый **Ядлінскаму** на 365 руб. і **Каліцкаму**—на 195 руб. з прычыны пераезду першага ў Асхабад і другога—на Каўказ. Далей, камісія выдае дазвол на заклад аблігацый **Тайцу** на 100 руб. з прычыны неабходнасьці заплаціць за электрычнасьць і ваду, а таксама на куплю чаравікоў і галёш на лета (нельга-ж чалавеку хадзіць летам без галёш...). **Пэральмітару** дасцца дазвол на заклад аблігацый у 120 руб. для набыцьця нікеляваных ложкаў і іншых рэчаў (хай чалавек сьпіць на добрых ложках, бо яшчэ т. Сямашка паказаў—«добры сон—зарука здароўя»).

Выходзіць, што камісія садзейнасьці дзяржкрэдыту пры НКФ БССР, тае цэнтральнае ўстановы, якая інструктуе ўсе акругі ў справе дзяржкрэдыту, якая выдае дырэктывы аб значэньні грамадзкага кантролю над захаваньнем аблігацый пазык, няўмысьна злачынна падрывае справу дзяржкрэдыту і сама садзейнічае разбазарваньню пазыкі. За паўтара месяцы камісіяй выдана дазволаў на продаж аблігацый на суму 1.105 руб. і на заклад на суму 515 руб.

Трэба зараз-жа спыніць падобнае зьявішча, за ~~разбазарваньне аблігацый~~ трэба прыцягнуць да грамадзкай адказнасьці.

К. Р.

Сьвінагадоўчыя гаспадаркі арганізуюцца марудна

Ня гледзячы на тое, што разьвіцьцё сьвінагадоўлі ў нашай гаспадарцы павінна адыгрываць вялікую ролю, мы ня маем патрэбных зрухаў у гэтай важнай рабоце.

Так, па некаторых акругах Беларусі да апошняга часу наглядаецца вельмі няўважлівыя адносіны да арганізацыі сьвіноводных гаспадарак. Сьвіноводныя калгасы вызначаліся нават без агранамаў і зоатэхнікаў. У выніку такое работы па Бабруйскай акрузе прышлося з вызначаных 20 сьвіноводных калгасаў 12 рэарганізаваць у прамысловыя. Такія-ж зьявы мелі месца ў Віцебскай і Менскай акругах.

Ёсьць выпадкі, калі ня толькі асобныя працаўнікі, але і цэлыя ўстановы (напр. акркалгасаюз і акрмалжывёлсаюз, у Бабруйску, Віцебску і Менску) да гэтага часу яшчэ не ўявілі сабе прыцытаў спэцыялізацыі сьвіноводных гаспадарак. Слаба таксама разгорнута работа па ўкамплектаваньні сьвіноводных гаспадарак маткамі. Амаль усюды будаўніцтва сьвінарнікаў ідзе вельмі марудна.

Яшчэ горш пастаўлена работа па арганізацыі пры Малжывсаюзах сьвіноводных аддзелаў. Ня гледзячы на пастанову калегіі НКЗ БССР аб хутчэйшай арганізацыі гэтых аддзелаў, акруговыя мал.-жывёлагадоўч. саюзы нічога канкрэтнага ў гэтым напрамку не зрабілі. Весткі аб канкрэтных мерапрыемствах па арганізацыі сьвіноводных аддзелаў атрыманы толькі ад Гомельскае, Аршанскае і Мазырскае округ. Прычым і па гэтых акругах аддзелы існуюць фактычна на паперы, ніякай канкрэтнай работы яны не вядуць.

Шмат перашкаджае разьвіцьцю сьвінагадоўлі позьняе разьмеркаваньне крэдытаў паміж калгасамі. Так, Белмалжывсаюз, атрымаўшы крэдыты ад усесаюзнага Калгасбанку, доўгі час не разьмяркоўваў іх па акругах і гэтым самым затрымліваў пабудову сьвінарнікаў і куплю матак.

Трэба ўлічыць усе гэтыя ненармальнасьці і даць на месцы ясныя ўказаньні наконт канкрэтнае работы па хутчэйшым разьвіцьці сьвінагадоўлі.

А. М.

З лістоў рабселькораў

СЯМЕЙНАСЬЦЬ У РЭЧЫЦЫ

У сталовай ЦРК (Рэчыца) на працяту доўгага часу мелі месца агідныя зьявішчы.

Загадчык сталовай харчаваў найшчыкаў сапсаванай гароднінай. Каб захаваць сьляды злачынства, **Кофман** — загадчык сталовай—выкінуў вон некалькі бочак сапсаванай капусты і гуркоў.

Група лёгкай кавалерыі аб гэтым і іншых злачынствах перадала матар'ял упоўнаважанаму РСІ, але апошні палічыў нямэтазгодным упікаць у такія «дробязі». Справа злачынства выкрыта яшчэ ў лютым месяцы і па сёньняшні дзень ня вырашана.

Апрача таго па пратэкцыі старшыні гарсавету **Шусьціна** прынята для работы ў сталовай сястра яго жонкі, былая нэпманка.

Сямейнасьцю Рэчыцкіх каапэратараў трэба зацікавіцца.

Аса.

МАТАР'ЯЛ ПСУЕЦЦА, А КЛЮБА НЯМА

З культурнымі ўстановамі ў гор. **Велі** (Полаччына) справа стаіць дрэнна. Няма для студэнцтва і камсамолу клюбу.

Звыш году таму назад працоўнасьць рэйскае насельніцтва патрабавала ад гарсавету перадачы аднэй сынагогі для агульна-гарадзкі клюб-тэатр. ЦВК Беларусі просьбу працоўнага насельніцтва задаволіў.

Гэтай зімой быў падвезены лес для рамсунту сынагогі. Але далей справа ня пайшла. Вывезены лес ляжыць не акораны і псуецца.

Наогул ніхто ня ведае, калі пачнецца перабудова сынагогі пад клюб. Рэйсавая партыі пасылае ў гарсавет, гарсавет сваю чаргу ў РВК, а апошні да загадчыка кіно т. Лучыны, які таксама ніякай ня робіць.

А клюбу як ня было, так і няма.

Бара.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

АД КАСТРЫЧНІЦКАГА РК КП(б)Б

РК КП(б)Б выклікае 23 мая на 19 гадз. у райком наступных т.т.:

Новікава—Калгасцэнтр, **Жыгмунда**—НКА, **Казючыца**—малочны завод, **Багард**—Белмалсаюз, **Мар'ясіну** — НКЮ, **Зэйфмана**—Акрпракуратура, **Міхайлава** НКЮ, **Суворава** — яч. ваг. майст., **Мінца** — яч. «Энэргія», **Тоўстага** — «Энэргія», **Зайчыка** — туб. інстытут, **Падольскага** — НКФ, **Бацьвіньніка** — Белсамправсаюз, **Эфрона** — Белсамправсаюз, **Пікмана** — Белсамправсаюз, **Эльнава** і **Коціка** — БСІКА, **Палічанскага, Айзэнбэрга, Вяліцкага, Вайнэровіча** — зав. «Энэргія», **Гінзбурга** — Белкаапсаюз, **Запатарова, Нікольскага і Рэзьнікава**—НКЮ, **Палякоўскага, Асяўнак** — абутк. фабрыка, **Айзэнбэрга**—зав. «Бальшавік», **Шаліма, Гершмана** — ЦКК-РСІ, **Губскую** — ДПУ, **Гутмана і Кірныс** — Калгасцэнтр, **Яўхімава** — ашчаднасса, **Любіча** — ЦСПСБ, **Майсевіча** — радыёцэнтр. **Кейліна** — ВСНГБ, **Вялікую** — МЦРК, **Цёмкіна** — ЦРД, **Цмык**—школа імя Чарвякова, **Негнявіцкага** — шчотачная фабрыка, **Ракава і Арабей** — ЦКК РСІ, **Лібман** — музэй рэвалюцыі, **Касывёра** — палата мер і вагі, **Дзэйца** — ЦІП, **Хеўліна** — Мен. адд. БКС, **Беразоўскую** — аўнэдтэхнікум, **Амельчыц**—экспл., **Губскага**—спраўдом.

СЁНЬНЯ

Нарада добраахвотнікаў культурна-плянавага сэктару ЦП саюзу ў 19 гадз. у памяшк. ЦП саюзу працасьветы. Выклік. т.т. **Наўмёнак, Гарашчэня, Замбржыцкі, Бранявіцкі, Кунда, Пальчык, Халфі, Масюкевіч, Леках, Брандарына, Царук Бэнэйсон,** ГК і МК саюзу працасьветы павінны таксама прысьлаць на гэту нараду сваіх прадстаўнікоў.

Клюб Ільліча (таварная). Пашыраная фракцыя ЖАКТ'у № 19. Яўка камуністых, што жывуць у жакце № 19, абавязкова. Пач. у 19 гадз.

Да ведама хатніх работніц мясцкому № 2. У 19 гадз. (клюб **Нархарч, Энгельса,6**), аг. сход хатніх работніц. Пасьля кіно.

Навуковая асацыяцыя. У 21 гадз. (клюб **«Мэдпрацаўнік»**)—3-мы аг. сход членаў навуковай асацыяцыі пры саюзе М. С. ПР.

Парадак дня: Рэарганізацыя мэдфаку БДУ (проф. **Кроль**), спрэчкі па дакладу праф. **Бурака**—склярома дыхавых трактаў.

ЗАЎТРА

Жансэкцыя Кастр. РК Мопру пальвае ў 18½ гадз. экскурсію ў т-ва па катаржан. Запраш. увесь жактаўскі актыў. Збор у райкоме Мопру.

Цэнтр. рэнтген. інстытут пры 1-й больніцы (Леніская, 54). У 20½ г. арганізацыйны сход рэнтгенолёгаў і дзьлёгаў. Запраш. дактары—рэнтгенолёгі, радыёлёгі і фізыкі г. Менску.

ЖАКТ № 9. У 18 гадз. у канцэлярыі жакту нарада камуністых-жыхароў жакту № 9. Яўка абавязкова.

1-шы мэдычны корпус БДУ. У 19 гадз. агульны сход асьпірантаў університэту на пытаньні праверкі працы асьпірантаў. Яўка ўсіх асьпірантаў абавязкова. На гэты сход запрашаюцца таксама і наступныя навуковыя працаўнікі, члены праверачных камісій: [illegible] бэрт, Ліўшыц, Камінскі, Дворжац, Мірадзіадзі, Кроль, Лябёдкін, Газаў, Колпікаў, Ленц, Громэр, Гофман, Ліцынскі Галанза, Канаплін, Магілеўч, Ноткін, Ігнатоўскі, Югаў, Піотухо, Гальперына, Саўсун, Ўсьпенскі, Сіцін, Бурстын, Лур'е, Манаў, Валадко, Вальфсон, Сякерская, Цітоў, Рыў, Васюцінскі Лявонаў, Гаўсман, Рубан, Сакалоўскі, Башкевіч, Маршак, Ліўш (рэнтген.), Пічэта, Стальны, Прыляеў, Змачынскі, Гімельфарб, Гесэн, Ін неў і Акімава.

ПАСЬЛЯЗАЎТРА

Навуковая асацыяцыя. У 21 гадз. праз менскую радыёстанцыю праф. [illegible] вонаў прачытае радыё-лекцыю для [illegible] частковых дактароў на тэму «Лячэньне страўніка-кішачных захварваньняў [illegible] дзяцей».

Пушкінская біб-ка. У 18 гадз. у памяшканьні біб-кі (Кастрычніцкая [illegible] № 5—1-шы паверх)—канфэрэнцыя [illegible] татчоў Пушкінскай біб-кі з яе аддзяленнямі, прыгарадныя хат-чыт. і перавачныя пунктамі. Просьба да дэлегатаў зьявіцца без спазьненьня.

БДУ. 24-га мая ў актавай залі БДУ адбудзецца **«Вечар ліквідатара»**, на [illegible] запрашаюцца ўсе студэнты БДУ, а таксама газэтныя супрацоўнікі. Пач. у 19 гадз.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

22-мая а 6-й гадз. увечары ў залі пасяджэньняў ЦСПСБ (д. Працы 2-гі паверх)

АДБУДЗЕЦЦА

пасяджэньне Бел. МБІТ сумесна з ІТР г. Менску

з удзелам прадстаўнікоў камсамолу, прафарганізацый і навуковых работнікаў

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Аб кадрах (даклад Дзяржпляну, садаклады ВСНГБ, НКЗему і НК Асьветы).
2. Аб арганізацыі Н. Т. О.

Яўка для ўсіх ІТР членаў бюро Н. Т. О. і Бюро ячэек Н. Т. О. абавязкова. Запрашаюцца прафэсары Вальфсон, Выдра, Рэктар палітэхнікуму, прадстаўнікі Б. Д. У., Інстытуту Прамысловасьці, інстытуту Леніна, ЦБ Пралетстуду і студ. арганізац.

Прэзыдыум Бел. МБІТ

СЁНЬНЯ, 21-га мая а 7 гадз. увеч. у памяшканьне Мен. АК МОПР адбудзецца

ПАШЫРАНЫ ПЛЕНУМ ФРУНЗДЎСК. РК МОПР

З наступным парадкам дня:
1. СПРАВАЗДАЧА ПРЭЗЫДЫУМУ РК.
2. АБ ЛЕТНЯЙ ПРАЦЫ і ПРАЦЫ З СЭЗОНЬНІКАМІ.
3. ДАВЫБАРЫ РАЙКОМУ.
4. РОЗНАЕ.

Яўка ўсіх членаў пленуму, старшынь і сакратароў ячэек абавязкова. Запрашаецца актыў.

Фр. РК МОПР.

ДА XVI ЗЬЕЗДУ ЎсеКП(б) ЯКАЎЛЕЎ

ДРУКУЕЦЦА І ХУТКА ВЫЙДЗЕ

Калгасны рух і ўздым сельскае гаспадаркі

Тэзісы дакладу на XVI партзьезьдзе.

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА

Мастацкі фільм вытворч. „ВОСТОККІНО"
ТУРКСІБ (Сталёвы шлях)
кіно-нарыс у 5-ці частках
Кіно-хроніка Савкіно № 23
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ)(2-гі ТЫДЗЕНЬ
тэатр кітайскіх ілюзій **ЛЮ-ФУ** па зусім новай праграме
Пачатак сэансаў: 7 г., 8 г. 30 м., 10 г.
Каса—ад 5 гадз.

КІНО Інтэрнацыянал

З прычыны посьпеху)—(2-гі тыдзень
Замежны мастацкі фільм
АПОШНІЯ НАВІНЫ
Звыш праграмы)—(культурфільм
КАЛМЫКІ
Пачатак 1-га сэансу а 7 г. увеч. | Каса ад 5 г.

КІНО Пралетары

Амэрыканскі фільм
ЧОРНЫ ЦЫКЛОН у 6-ці частках
У галоўных ролях— А. РЭКС і Х. АЛЕН
Звыш праграмы — КУЛЬТУРФІЛЬМ
-) **КАМЧАТКА** ў 1-ой частцы (-
Пачатак 1 сэансу а 7 г.
Каса адчынена ад 5 гадз.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр"

Мастацкі фільм
БЕЛЫ НАЕЗЬНІК (Бог вайны)
кіно-п'еса ў 6-ці частках
Звыш праграмы—культурфільм
ДАГЕСТАН у 2-х частках.
Пачатак 1-га сэансу а 2 г., 2-га—3 г. 30 м.
Каса адчынена — з 12 г. дня.

КІНО Спартак

мастацкі фільм
ЧАЛАВЕК з ПАРТФЭЛЕМ
драма ў 6 частках
Пач. сэансаў: 7 г. 15 м., 9 г., 10 г. 30 м.
Каса—з 5 гадз. 30 м.

50 К. кошт публікацыі аб згубе дакумента

Ідзеце на выстаўку друку

Пры габінэце журналістыкі Камуністычн. Унівэрсытэту Беларусі імя Леніна

адкрыта выстаўка друку

Выстаўка заключае ў сябе **звыш 2.000 экспонатаў** і разьбіваецца на аддзелы, галоўнымі з якіх зьяўляюцца:

1. Рэвалюцыйны друк 18 г.
2. Бальшавіцкі друк з 17 па 22 г.
3. Друк СССР на 30 г.
4. Замежны рэвалюцыйны легальны і нелегальны друк.
5. Аддзел МОПР'у.
6. Аддз. Міжнародн. рабоч. сувязі.

Выстаўка зьмяшчаецца ў памяшканьні Камвузу, 2 паверх, пакоі 25 і 26 і будзе працаваць штодзенна да 25-га мая.

Наведваньне выстаўкі ад 4 да 10 гадз. увечары, як экскурсіям, гэтак і індывідуальна.

Для экскурсій будуць вызначаны кансультанты.

Габінэт журналістыкі КУБ.

АБВЕСТКА.

Згодна пастановы НКП і НКАЗ БССР ад 18-IV—1930 г. № 27(апублікаў. у газ. «Савецкая Беларусь» ад 6-V за № 104)

ІНСПЭКЦЫЯ АХОВЫ ЗДАРОЎЯ

прапануе ўсім перапічаным у пастанове МЭД. ПРАЦАЎНІКАМ

ЗЬЯВІЦЦА

ў Акруговую Інспэкцыю Аховы здароўя з 21 мая па 26-га мая г. г. ад 2-х да 4-х гадзін дня для рэгістрацыі.

Менская Акруговая Інспэкцыя Аховы Здароўя.

Продается ПИШУЩАЯ МАШИНКА

с русско-латинским шрифтом сист. «Полиглот»

Видеть Революционная 22 кв. 6

Ільна-Пяньковаму Аб'яднаньню ВСНГ БССР

(Менск, плац Волі, 21-1)

ПАТРАБУЮЦЦА

для работы на заводах па першапачатковай